Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

9 ГОД ВЫДАНЬНЯ.

КОШТ НУМАРУ 5 КАП.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ялы прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Навыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не вярочаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: На 1 месяц — 90 к. „ 3 „ — 2 р. 70 к. „ 6 „ — 4 р. — к. „ 1 год — 8 р. — к. Выезд адрасу: Іншагародніх — 20 к. месцовых — 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ: За радок капіталу шэсьця тэксту — р. 50 к. За радок капіталу шасцёх тэксту 1 р. — к. За радок капіталу перад тэкстам 1 р. 50 к. Сьвешныя на 50 проц. дарожэй. Зыш тарыф бярэцца 10 проц. налогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ: За 1 дакумент — 35 кап. За кожны дадатковы — 15 „ Беспрацоўных і чырвонаармейцаў за дакумент — 15 „ За кожны дадатковы — 5 „ Публікацыі ЗАГО'ту—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газэты, на ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і на ўсіх пашт.-тэл. канторах. АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА

№ 63 (2251) Чацьвер, 15-га сакавіка 1928 г.

Да 5-га ўсебеларускага зьезду КСУ.

Мінула ўжо шмат часу, як аформіліся КСУ (камітэты сялянскай узаемадапамогі). За гэты пэрыяд праца КСУ мае вялікія дасягненьні. У галіне арганізацыйнай камітэты аформіліся юрыдычна, завяёван аўтарытэт сярод шырокіх мас працоўнага сялянства, знойдзен правільны напрамак працы. Здольнае кіраваньне зьнішчыла валакіту і бюракратызм.

Аднак, трэба зазначыць, што ўпаўнаважаныя і старшыні сельсаветаў далёка ня ўсе дапамагаюць справе палепшаньня становішча беднаты. Ёсьць факты, якія сьведчаць аб нядбайнасьці гэтых працаўнікоў.

У раённых КСУ справа наладжана досыць добра.

У апошні час удалося падабраць амаль што на ўсіх раённых працаздольных таварышоў. Там, дзе гэтага няма, праца праводзілася слаба і адбівалася на ніжэйшых камітэтах. Напрыклад, ні раённыя, ні сельскія КСУ ня ўжывалі вялікіх захадаў, каб спагнаць выдадзеныя пазыкі. Магазыны зімавалі пароженымі. Сяброўскія ўзносы спаганяліся дрэнна. Гэта стварыла погляд, што КСУ павінны адшукваць сродкі для дапамогі, а не даваць гэтую дапамогу са сродкаў самога сялянства. Зразумела, часам у гэтых недарэчнасьцях вінаваты былі і акруговыя інспэктары КСУ, якія сваячасна ня здолелі, ці не жадалі (ёсьць і такія выпадкі) наладзіць, як сьлед, справу КСУ.

Цэнтральны камітэт КСУ поўнасьцю справіўся з ускладзенымі на яго задачамі: хутка перайшоў да кіраўніцтва працаю, сваячасна ўлічыў задачы, якія стаяць перад КСУ і інш., зрабіўшы гэта пры апараце ў 3 функцыянальных і 1 тэхнічнага працаўнікоў.

Да пачатку 1928 году мы бачым, што вытворчая дзейнасьць КСУ значна пашырылася: ёсьць 62 жыцьцядзольных цагляных заводы; 54 млыны, 7 смалярняў і 425 пракатных пунктаў. Фонд КСУ на 1-га кастрычніка 1927 г. складаўся з 47.574 пудоў збожжа і 131.337 руб., апроч выдадзенае пазыкі ў ліку 354.822 пуд. збожжа і 131.492 руб. Лічбы сьведчаць, што прадпрыёмствы зьяўляюцца добрае матар'яльнае базаю і складаюць не малую каштоўнасьць, але з фондамі справа горш, бо пераважная частка іх знаходзіцца на руках у беднякоў і сераднякоў. Такое становішча не дае магчымасьці ўтварыць хлеба-запасныя магазыны, а гэта адбіваецца на той частцы сялянства, якой неадкладна трэба даць пазыку.

Таксама кепска спаганяецца насенная пазыка, якая па некалькі гадоў знаходзіцца ў асобных сялян.

Даўней хлеба-фуражныя магазыны будаваліся за кошт самога сялянства, насенныя фонды зьбіраліся таксама з сялянства, прычым усе плацілі безагаворачна, а зараз нават выдадзенай пазыкі некаторыя сяляне ня хочуць вяртаць назад. З гэтымі выпадкамі трэба сурова змагацца, ня спыняючыся нават перад судом, бо неабходна стварыць погляд, што наогул кожная пазыка павінна вяртацца ў тэрмін, а асабліва ў грамадзкі фонд.

За апошнія 2 гады КСУ далі не малую дапамогу сялянству: зваротнай пазыкай здаволена 118452 гаспадаркі, якія атрымалі 395495 пу. насеньня і 163914 руб. грашыма. Безвароротную дапамогу атрымалі 5211 гаспадарак у ліку 3205 пуд. насеньня і 22606 р. Апроч таго, у 10282 гаспадарках апрацавана 2566 дзес. зямлі і пабудавана 192 памяшканьні; на гэта патрачана 18372 працоўных дзён. Па сел.-гас. падатку 245026 гаспадарак мелі палёгку на суму 1116624 руб.; згодна хадайніцтва КСУ вызвалена ад абавязковага страхаваньня 210749 гаспадарак на агульную суму ў 615562 рублі, а таксама атрымана лесу па льготнай цане для 54000 гаспадарак.

Які-ж напрамак павінен мець зьезд КСУ? Беднякі і сераднякі разумеюць, што трэба цалкам праводзіць дырэктыву XУ зьезду УсеКП(б) і на гэтых асновах будаваць сваю далейшую працу. Зьезд павінен будзе падыйсьці канкрэтна да вырашэньня наступных задач:

наладзіць працу ў галіне ўзьняцьця сельскай гаспадаркі праз аб'яднаньні ў калектывы;

каапэраваць усё бядняцка-серадняцкае жыхарства;

пабудаваць грамадзкія магазыны, склясьці насенныя фонды і фонды для дапамогі ў гады неўраджаю, стыхійных навал і ц. д.;

устанавіць цьвёрдыя нормы сяброўскіх узносаў і мэтады іх спагнаньня;

разьвіць вытворчую дзейнасьць да такіх разьмераў, каб яна магла дапамагчы ў аднаўленьні сельскай гаспадаркі;

разьвіць мэтазгоднае выкарыстаньне пракатных пунктаў пры асаблівай увазе якасьці і захаваньню інвэнтару;

перавесьці зямельныя вучасткі КСУ на паказальныя, а таксама правільна эксплёатаваць іх;

аддаць сур'ёзную ўвагу справе наданьня палёгак ад ураду беднаце, сем'ям чырвонаармейцаў, інвалідам вайны і сем'ям забітых на вайне, а таксама чырвоным партызанам;

правесьці надыходзячую веснавую засеўную кампанію.

Наша задача—пабудаваць працу так, каб Беларусь у галіне сельскай гаспадаркі стала на шлях таварнасьці. Трэба пашырыць засеўны клін і засеў тэхнічных культур; КСУ павінны выкарыстаць усе свае фонды, каб забясьпечыць жыхарства насеньнем. Гэта пытаньне павінна быць сур'ёзна абмеркавана і ўхвалена па ім пастановы трэба абавязкова выканаць, не зважаючы ні на якія перашкоды. Гэтым самым мы шпаркімі крокамі рушымся да калектывізацыі сельскай гаспадаркі і да індустрыялізацыі нашага краю.

П. У. Калінін.

Памёр тав. Джэмс Мартон.

ПЕРАДСЬМЕРТНЫ ТЭСТАМЭНТ МАРТОНА АНГЕЛЬСКІМ ПРАЛЕТАРЫЯМ

ЛЕНІНГРАД, 12-III. 12-га сакавіка васьля доўгае і цяжкае хваробы (сарком) памёр рабочы «Красного Путиловца» англійскі лідэйшчык Джэмс Мартон, прыехаўшы з Англіі ў СССР у 1926 г. па выкліку чэдзі Астор.

Перад сьмерцю Мартон паслаў сэкратару ангельскае кампартыі ліст, у якім выказвае сваё шчасьце, што браў хоць неялікі ўдзел у будаўніцтве новае сацыялістычнае дзяржавы. МАРТОН ЗАКЛІКАЕ АНГЕЛЬСКІХ РАБОЧЫХ БАРАНІЦЬ СССР, ЯК БАЦЬКАЎШЧЫНУ РАБОЧЫХ УСЯГО СЬВЕТУ.

Аўганскі манарх у Лёндане.

Цьвёрдалобыя шукаюць у госьця партнёра для антысавецкае гульні.

ЛЁНДАН, 13-III. Аўганскі падышах Аманула сёньня прыехаў у Лёндан. На сярэдзіне Ляманшу параход, які вёз падышаха, быў спатканы эскадраю ангельскіх вайсковых суднаў. У часе высадкі на бераг у Дуўры падышаха сустрэў прынц Уэльскі (наступнік ангельскага трону). З Дуўру ў Лёндан падышах быў дастаўлен спэцыяльным поездам, а на Вікторыя-Стэйшэн (вакзал у Лёндане) ён быў сматканы ангельскім каралём, разам з якім і накіраваўся ў Букінгемскі палац.

* * *

ЛЁНДАН, 13-3. Уся прэса аддае шмат увагі прыезду аўганскага падышаха Амануллы ў Лёндан.

„Морнінг Пост", пункт гледжаньня якое бязумоўна падзяляецца большасьцю ўплывовых грамадзкіх колаў Англіі, завярае Амануллу, што ў Англіі ё и знаходзіцца «сярод прыяцеляў». «Мы ня ведаем,—піша газэта,—ці будзе адчуваць падышах тое-ж пачуцьцё безапасьнасьці, калі ён узойдзе на тэрыторыю Расеі і ўспомніць, што Масква выказала сябе бязьлітасным ворагам усіх краёў і ўсіх рэлігій. Няма ніводнае рэлігіі і ніводнага караля, якому-б не пагражала палітыка Савецкае Расеі. Аднак, асабліва моцна пагражае гэтая дзяржава Аўганістану, бо яна мае надзею ўдарыць па Брытанскай імпэрыі, перабраўшыся праз Памір, што немагчыма, пакуль расейцы ня змогуць прайсьці маршам праз Аўганістан" (Газэта, бязумоўна, хоча паказаць неабходнасьць англа-аўганскага ваеннага саюзу проці СССР, хоць і не гаворыць аб гэтым адкрыта).

ЧАНКАЙШЫСТЫ НЯ У СІЛЕ ЗАДУШЫЦЬ РЭВАЛЮЦЫЮ.

ГАРАДЫ ПОЎДНЮ ПАД КАМУНІСТЫЧНЫМ УПЛЫВАМ.

ШАНХАЙ, 13-3. Ангельская газэта «Шанхай Мэркуры» заяўляе, што ў Ханькоу захаваўся даволі моцны камуністычны асяродак і што войска ханькоўскае ўлады «занядужана на камуністычныя ідэі». Уплыў камуністаў вельмі моцны ў невялікіх гарадох правінцыі Хубэй і Хэнані.

Улада ў Ханькоу апячатала памяшканьне Сючуанскага зямляцтва, абвінавачваючы зямляцтва ў падтрыманьні камуністаў. Ва Учане па загадзе начальніка штабу гарнізону ўчынен паскок на памяшканьне падрыхтоўчых курсаў унівэрсытэту. Паведамляюць, што выкрыта шмат літаратуры камуністычнага зьместу. Арыштавана звыш 40 настаўнікоў і студэнтаў.

Камуністычныя генэралы Гао-І і Люшы-Фу, маючы буйныя сілы, распачалі наступ проці Чжаоляна (у Гуандунскай правінцыі). Павятовы горад Хайфынь заняты кантонскім войскам, атрымаўшы падмацаваньне з Сватоу, аднак навет усё яшчэ ў руках рэвалюцыйнага войска, кіруемага камуністамі. Паведамляюць, што рэвалюцыйнае войска, якое знаходзіцца ў павеце Хайфынь, распаўсюдзіла сваю ўладу на горны раён Пучын і арганізавала там саветы.

У раёне Чжаншу (90 клм. на поўдзень ад Нанчана) выбухнуў моцны паўстанцкі рух, кіруемы камуністамі. У паўстанцкіх атрадах налічваецца звыш 4 тысяч чалавек.

Аднаўленьне працэсу Беларускай Грамады

ЗАБЛЫТАНЫЯ ПАКАЗАНЬНІ АГЕНТА АХРАНКІ.

ВАРШАВА, 13-III. Пасьля двухтыднёвага перапынку ўчора ў Вільні аднавілася слуханьне працэсу Беларускае Грамады.

На ўчарайшым (сёмым) пасяджэньні суду былі заслуханы паказаньні двух сьведак абвінавачаньня: некага Бушмана, нядаўна выпушчанага з астрогу, і рэфэрэнта аддзелу безапаснасьці пры камісары гор. Вільні—Піатроўскага.

Бушман заяўляе, што ён нядаўна выпушчан з астрогу, дзе прасядзеў 11 месяцаў, з іх—3 месяцы за спробу нелегальнага пераходу польска-савецкае мяжы. Сьведка заяўляе, што ня мае чаго казаць наконт працэсу і высунутых падсудным абвінавачаньняў.

Сьведка Піатроўскі заяўляе, што яшчэ ў 1925 г. ён заўважыў, як абвінавачаны Тарашкевіч, былы дэпутат сойму, «распачаў займацца антыдзяржаўнаю дзейнасьцю». Піатроўскі завярае далей, што ў пэрыяд арганізацыі Беларускае Грамады Тарашкевіч і яго аднадумцы склікалі некалькі канспіратыўных сходаў. Калі сьведка пераходзіць да падрабязнага аналізу праграмы Беларускае Грамады, дык Сьмяроўскі зварочвае ўвагу суду на тое, што сьведка ня мае ніякага права выступаць у якасьці экспэрта. Суд не зварочвае ўвагі на пратэст абаронцы. У далейшых сваіх паказаньнях Піатроўскі спрабуе асабліва падкрэсьліць, што „Грамада высоўвала тыя-ж патрабаваньні, што і кампартыя". Сьведка завярае, што абвінавачаныя Тарашкевіч, Рак-Міхайлоўскі і іншыя выдатныя сябры Беларускае Грамады зьяўляліся адначасна сябрамі і Грамады і кампартыі Польшчы. На запытаньне абароны, адкуль гэтыя весткі яму вядомы, Піатроўскі заяўляе, што ён даведаўся аб гэтым „ад камуніста, прозьвішча якога, па прычынах канспірацыі, ён ня можа назваць". Як толькі суд пераходзіць да заслуханьня паказаньняў Піатроўскага аб агітацыі сяброў Беларускае Грамады ў польскай арміі, дык дзьверы суду зачыняюцца і ўся іншая частка пасяджэньня адбываецца пры зачыненых дзьверах.

У ПОЛЬШЧЫ ПАСЬЛЯ ВЫБАРАЎ.

ЗЬМЕН У ЎРАДЗЕ ПІЛСУДЗКАГА НЯ БУДЗЕ.

«Кур. Віл.» паведамляе, што сучасны польскі ўрад ня думае перад новаабраным соймам падавацца ў адстаўку. «Асяродкам гэтага зьявішча,—кажа «К. В.»—была соймаўладчая форма ўраду да мая 1926 г. Цяпер гэтая магчымасьць зусім выключана».

ШТО БУДЗЕ З УРАДАВЫМ БЛЁКАМ У СОЙМЕ?

«Кур'ер Віленьскі» (№ 56) паведамляе, што пагалоскі аб тым, быццам урадавы блёк быў створан толькі для выбараў, а ў сойме ён рассыплецца, ні на чым не абапёрты. Урадавы блёк у сойме падзеліцца на фракцыі, але на соймавай трыбуне будзе выступаць аналітым фронтам.

КОЛЬКІ БУДЗЕ ПАСЛОЎ-КАБЕТ У СОЙМЕ?

У новавыбраным сойме будзе 7 паслоў-кабет. У папярэднім сойме было 9 кабет.

ПЕРАВЫБАРЫ Ў ГНЕЗЬНЕ.

ВАРШАВА, 13-III. Згодна патрабаваньня ППС, якая апратэставала выбары ў сойм у горадзе Гнезьне, дзе выяўлены злоўжываньні ўлады пры выбарах, у гэтым горадзе назначаны перавыбары.

При першых выбарах сьпіс ППС атрымаў 10 тысяч галасоў, але задняю датаю быў скасаваны.

КАРФАНТЫ ЗРОКСЯ МАНДАТУ.

Выбраны паслом сойму вядомы правы дзеяч Карфанты, якога абвінавачваюць у розных гаспадарчых афорах, зрокся свайго мандату.

КАНФІСКАЦЫЯ «ВОЛІ ПРАЦЫ».

Урадавы камісар г. Вільні сканфіскаваў № 1 беларускай газэты «Воля Працы» за зьмяшчэньне ведамасьці, у якой угледжаны праступкі проці арт. 1 распараджэньня прэзыдэнта рэспублікі.

РАСЕЙЦЫ АБ ВЫНІКАХ ВЫБАРАЎ У СОЙМ.

Старшыня «Расейскага Народнага Аб'яднаньня» у Польшчы п. Лелявскі заявіў супрацоўніку белагвардзейскай газэты «За Свободу», што расейцы хоць і атрымалі на выбарах у сойм толькі адзін мандат, аднак, на сьпіскі «Р. Н. А.» падана было 150.000 галасоў, што пры дзельніку 20.000 павінна было-б даць 7-8 мандатаў.

КАНФІСКАЦЫЯ ПЭПЭЭСАВАЙ КНІЖКІ.

Па прыказу адміністрацыі сканфіскавана прадвыбарчая брашура, выданая ППС, пад назваю „Роботнік".

АРЫШТЫ Ў ПЛОЦКУ І ВАРШАВЕ.

Апошнімі днямі паліцыя арыштавала ў Плоцку дзьве асобы і ў Варшаве чатыры асобы па абвінавачаньні іх у камуністычнай дзейнасьці.

АРЫШТЫ Ў ЗАХ. БЕЛАРУСІ.

Гэтымі днямі паліцыя арыштавала ў вёсцы Бароны, Жуковскай вол., пяць асоб, якія быццам належаць да кампартыі Зах. Беларусі. Справа накіравана ў суд.

Контр-рэвалюцыйны замах павялічыць настарожанасьць пралетарыяту.

Тав. Чубар аб донбаскай змове.

ХАРКАЎ, 13-Ш. У гутарцы з карэспандэнтам РАТАУ аб контр-рэвалюцыйнай змове групы буржуазных спэцыялістых у Донбасе—старшыня Украіны Чубар заявіў: „Контр-рэвалюцыйная змова групы інжэнэраў і тэхнікаў у Шахцінскім раёне ёсьць вынік таго, што ў савецкіх рэспубліках яшчэ маюцца рэшткі прыхільнікаў буржуазеі, якія ажыўляюцца ў моманты абвастрэньня адносін між СССР і капіталістычным абкружэньнем. У зьвязку з ажыўленьнем контр-рэвалюцыйнае працы гэтых асоб у сэнсе наяўсеньня шкодніцтва нашай гаспадарцы, узмацнілася іх праца па вярбоўцы сваіх прыхільнікаў з кола асоб, якія ня вераць у трываласьць савецкае ўлады, вагаюцца між пралетарскай дзяржавай і інтарэсамі капіталістычнае сыстэмы. Мы павінны цьвёрда падкрэсьліць, што такіх шкодникаў у савецкіх рэспубліках засталося, бязумоўна, мала, і ўсе іх спробы затрымаць, прыпыніць тэмп гаспадарчага росту пралетарскае дзяржавы поўнасьцюахвяраваны на няўдачу.

Спэцыялісты, якія ідуць у нагу з рабочаю клясаю, ужо ў шэрагу рэвалюцыйнай адмежаваліся ад групы варожых пралетарыяту спэцыялістых-шкодникаў. Аднак, кожны спэцыяліст павінен памятаць, што выяўленая шкодная дзейнасьць групы спэцыялістых выкліча больш уважлівыя адносіны да кожнага іх кроку з боку рабочых. Кожнаму спэцыялісту павінна быць таксама зразумела, што гэты кантроль будзе натуральнай рэакцыяй на тое, што група інжэнераў, якая карысталася ў некаторых выпадках амаль неабмежаваным давер'ем, ня толькі не апраўдала давер'я, але і выкарыстала яго для ўчыненьня шкоды пралетарыяту.

ГАНЬБА КОНТР-РЭВАЛЮЦЫЙНЫМ ЗМОЎШЧЫКАМ.

МАСКВА, 13-3. Агульны сход спэцыялістаў ВСНГ СССР у аднагодна ўхваленай рэзалюцыі выказвае глыбокае абурэньне ў зьвязку з злачынствам групы спэцыялістых у Донбасе, патрабуе бязьлітаснага пакараньня здраднікаў і заклікае ўсіх спэцыялістых прамысловасьці шчыльней згуртавацца навакол партыйных і прафэсыянальных арганізацый, каб супольнымі сіламі стварыць умовы, пры якіх наша гаспадарка была-б гарантавана ад паўтарэньня падобных зьявішчаў.

* * *

МАСКВА, 13-3. 3-ці ўсесаюзны зьезд інжэнэраў і тэхнікаў камунальнае гаспадаркі ўхваліў рэзалюцыю, дзе ад імя 6 тысяч інжэнэраў і тэхнікаў камунальнае гаспадаркі ганьбіць кучку злачынцаў, якія адпалаціліся ад давер'е шырокіх рабоча-сялянскіх мас і савецкага ўраду агідным здраднічтвам, і завярае савецкі ўрад, што злачынныя элементы будуць бязьлітасна зьнішчаны ў шэрагах савецкага інжэнерства.

Здраднікам—бязьлітасная кара.

ХАРКАЎ, 13 III. З шмат якіх гарадоў Украіны надыходзяць весткі аб вострых рэзалюцыях абурэньня, ухваленых інжэнэрамі, тэхнікамі і іншымі спэцыялістымі ў зьвязку з выкрытаю контр-рэвалюцыйнаю эканамічнаю змовою ў Шахцінскай акрузе. Рэзалюцыі патрабуюць самага бязьлітаснага пакараньня ўдзельнікаў змовы.

МАСКОЎСКІ ПАРТАКТЫЎ АБ ПАСТАНОВАХ ПЛЕНУМУ ВЫК. К-ТУ КАМІНТЭРНУ.

МАСКВА. Актыў маскоўскае арганізацыі УсеКП(б), заслухаўшы даклад Бухарына аб выніках пленуму выканкому Камінтэрну, ухваліў рэзалюцыю, у якой адзначае правільнасьць павароту тактыкі ангельскае і французкае кампартыі, намечанага пленумам выканкому Кимінтэрну. Трэба маналымаль'на завострыць барацьбу капітуляцкі проці міжнароднае сацыял-дэмакратыі.

Адзначаючы, што трацкісцкая апазіцыя, сабраўшая навокал сябе заграніцаю ўсе самыя горшыя рэнэгацкія элементы і стаўшая на пазіцыі «левых» правадыроў сацыял-дэмакратыі, перашкаджае пераходу сацыял-дэмакратычных рабочых на бок Камінтэрну, сход вітае пастанову пленуму аб тым, што прыналежнасьць да трацкісцкае апазіцыі несумясьціма з прыналежнасьцю да Камінтэрну.

Нямецка-польскія перамовы ў тупіку.

БЭРЛІН, 7-3. Варшаўскі карэспандэнт «Берлінэр Тагеблят» зазначае, што польска-нямецкія гандлёвыя перамовы зайшлі ў тупік. Нямецкі міністр земляробства дамагаўся, каб «нямецкай прамысловасьці магчыма шырэй была адчынена брама». Гэтага, аднак,—піша карэспандэнт,—зараз амаль зусім нельга ажыцьцявіць.

Раэвой камуністычнага руху ў Грэцыі.

АНТЫЎРАДАВАЯ ДЭМАНСТРАЦЫЯ РАБОЧЫХ У САЛОНІКАХ.

ВЕНА, 12-III. З Атэн паведамляюць, што салоніцкія рабочыя наладзілі дэманстрацыю пратэсту проці арышту камуністаў, абвінавачаемых у падтрыманьні сувязі з рэвалюцыйным македонскім камітэтам. Для разгону дэманстрацыі ўлада паслала два кавалерыйскіх эскадроны. Група дэманстрантаў забарыкадавалася і нібы аказала ўзброены адпор паліцыі і войску. У часе перастрэлкі паранена некалькі рабочых і салдат. 10 удзельнікаў дэманстрацыі арыштавана.

КАМУНІСТЫЧНАЯ СТУДЭНЦКАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ.

ВЕНА 13-III. Водаўг паведамленьняў з Атэн, там учора адбыўся сход студэнтаў-камуністаў, на якім Анры Барбюс, прафэсар Эйнштэйн і Панаіт Істраты былі абраны ганаровымі членамі камуністычнае студэнцкае арганізацыі.

ІНСЬПІРАВАНЫ ПРАЦЭС „САВЕЦКІХ ШПІЁНАЎ".

ПАРЫЖ, 13-3. У 2-м аддзяленьні парыскага апраўчага суду (які разглядае справы бяз удзелу прысяжных пасядацеляў), распачаўся разгляд справы «аб шпіянажы на карысьць СССР». У якасьці абвінавачаных па справе прыцягнуты да адказнасьці: Ружэір, Клепэ, Лемэр, Рокель, Бэрт, Бэртран, Фрытч, Пілё, Бэсон, Жэй і Ноты. Апроч таго, завочна прыцягнуты да адказнасьці: Кромэ, Клярак і дэ-Шарль. Падсудных абараняе 11 абаронцаў, у тым ліку Торэс, Бэртон і Легрокер. Згодна патрабаваньня пракурора, суд будзе разглядаць справу пры зачыненых дзьверах, не зважаючы на пратэсты абароны.

Прыезд савецкае дэлегацыі ў Жэневу.

ЖЭНЕВА, 13-III. Сёньня ўвечары ў Жэневу прыехала дэлегацыя СССР на сэсію падрыхтоўчае камісіі канфэрэнцыі аб разброеньні на чале з тав. Літвінавым.

Да сельска-гаспадарчых і лясных рабочых усяго сьвету.

Шэсьць год уціску і панаваньня польскіх абшарнікаў і буржуазеі над Заходняю Беларусьсю прывялі апошнюю да поўнага эканамічнага і культурнага заняпаду.

Малазямельле, асадніцтва, нязвычайна цяжкія падаткі, штрафы, забарона школы на роднай беларускай мове, нацыянальнае прыгнечаньне і бяспраўе—усё гэта вісіць нязьмерным цяжарам на шыі беларускага працоўнага народу.

Палітыка польскае буржуазеі, накіраваная на тое, каб зрабіць Заходнюю Беларусь калёніяй, з дню ў дзень пагаршае становішча працоўных мас Заходняй Беларусі.

Панаваньне польскага фашызму прывяло краіну да поўнага эканамічнага разбурэньня, культурнага заняпаду і голаду.

Працоўныя масы Заходняй Баларусі стогнуць пад жалезнаю пятою польскага фашызму. Абурэньне рабочых, батракоў і працоўнага сялянства шукае выхаду. У адказ на сьвірэпы тэрор і прыгнечаньне пачынаецца барацьба за нацыянальнае і сацыяльнае вызваленьне, выказчыцай якога зьяўляецца Сялянска-Работніцкая Грамада.

Суд над Грамадою—гэта суд над працоўным народам Заходняе Беларусі, над усёй беларускай нацыяй.

Працэс над Грамадою—гэта падрыхтоўка тылу для вайны з СССР. Саюз сельска-гаспадарчых і лясных рабочых Беларускае Сацыялістычнае Рэспублікі заклікае сельска-гаспадарчых і лясных рабочых усяго сьвету далучыцца да голасу і40 тысяч сельска-гаспадарчых і лясных рабочых, рабочых дробных прадпрыёмстваў на вёсцы і служачых земляўстаноў Беларускае Савецкае Сацыялістычнае Рэспублікі і заявіць свой магутны пралетарскі пратэст супроць нячуваных зьдзекаў, катаваньня і нацыянальнага прыгнечаньня польскага фашызму над працоўным народам Заходняе Беларусі, супроць працэсу над лепшымі прадстаўнікамі гэтага народу—членамі Грамады.

Далоў польскі фашызм!

Далоў фашысцкі суд!

Пракляцьце правакатарам—здраднікам рабоча-сялянскай справы!

Сельска-гаспадарчыя і лясныя рабочыя ўсяго сьвету, уступайце ў шэрагі МОПР'у!

Няхай жыве барацьба за вызваленьне Заходняй Беларусі з-пад панаваньня польскага фашызму!

Няхай жыве Савецкая Беларусь!

Няхай жыве Кампартыя Заходняе Беларусі!

Сельска-гаспадарчыя і лясныя рабочыя, пад штандарт камунізму!

САЮЗ СЕЛЬСКА-ГАСПАДАРЧЫХ І ЛЯСНЫХ РАБОЧЫХ БЕЛАРУСІ.

Да ЦК і ўсіх арганізацый прафсаюзу сельгаслесрабочых СССР.

Цэнтральнае Праўленьне Прафсаюзу Сельгаслесрабочых БССР, па даручэньню шэрагу саюзных канфэрэнцый, зьвяртаецца да ЦК і ўсіх арганізацый прафсаюзу сельска гаспадарчых і лясных рабочых СССР далучыцца да голасу пратэсту беларускіх сельска-гаспадарчых і лясных рабочых супроць працэсу над Беларускай Сялянска-Работніцкай Грамадой, які адбываецца ў Вільні у твары якой польскі фашысцкі ўрад пасадзіў на лаўку падсудных працоўнае сялянства і батрацтва Заходняй Беларусі.

ЦЭНТР. ПРАЎЛЕНЬНЕ САЮЗУ СЕЛЬГАСЛЕСРАБОЧЫХ БЕЛАРУСІ.

Барацьба бэрлінскіх мэталёўцаў прадана рэфармістамі.

«РОТЭ ФАНЭ» КЛІЧА РАБОЧЫХ НЕ ПАКІДАЦЬ БАРАЦЬБЫ.

БЭРЛІН, 13-III Рэфармісцкае кіраўніцтва саюзу мэталёўцаў заклікае струмантальных рабочых на працу, бо арбітражная пастанова абвешчана абавязковаю.

Як раз у той час, калі ўхвалялася абавязковасьць арбітражнае пастановы ў справе канфлікту бэрлінскіх струмантальных рабочых, адбываўся дыскусійны сход струмантальшчыкаў. Кіраўнік саюзу мэталёўцаў Урых выказаўся за тое, каб адмавіць працу ў выпадку, калі арбітражная пастанова будзе абвешчана абавязковаю. Усе прамоўцы, браўшыя ўдзел у дыскусіі абурана вымагалі ня спыняць барацьбы, прычым патрабавалі, каб змагацца і з самым фактам абвяшчэньня арбітражнае пастановы абавязковаю. Атрыманыя ў часе сходу весткі, што арбітражная пастанова прызнана абавязковаю, выклікалі моцнае абурэньне струмантальшчыкаў. Левае крыло падало рэзалюцыю ня спыняць барацьбы. Рэзалюцыя была спатканa гучнымі воплескамі пераважнае большасьці прысутнічаўшых. Нават «Форвэртс» прымушан быў прызнаць, што Урыху толькі пасьля доўгае барацьбы ўдалося супакоіць сход. Пасьля гэтага ён абвясьціў дыскусію скончанаю і, не дапусьціўшы ніякага галасаваньня па рэзалюцыі левага крыла, проці волі большасьці прысутнічаўшых зачыніў сход.

„Ротэ Фанэ" заклікае струмантальшчыкаў ухваляць на сваіх сходах рэзалюцыі за працяг барацьбы і пасылаць делегацыі ў прафсаюзы.

БЭРЛІНСКІЯ ТЭКСТЫЛЬШЧЫКІ ІДУЦЬ З КАМПАРТЫЯЙ.

БЭРЛІН, 13-Ш. Учора на перавыбарах праўленьня мясцовага аддзелу прафсаюзу тэкстыльшчыкаў перамог сьпіс левае рэзалюцыйнае меншасьці, які атрымаў 355 галасоў проці 248 галасоў рэфармістаў.

Да гэтае пары ў праўленьне ўваходзілі толькі рэфармісты.

У Літве.

ПРЫСУД НАД ПАЛЯКАМІ Ў КОЎНІ.

Віленскае «Слово» (№ 59) паведамляе, што ваенны суд прыгаварыў да кары сьмерцю за шпіянаж на карысьць Польшчы двух палякаў Садоўскага і Арлова (? Рэд).

АРЫШТЫ Ў КОЎНІ.

Гэтымі днямі ў Коўні арыштаваны б. паслы літоўскага сойму Міктыс і Драўтэліс—правадыры правай партыі «саюз гаспадароў». Арыштаваны яны з прычыны выкрыцьця аграмаднай афёры з дастаўкай сала для інтэндатуры ў Марыямпалі.

ЗАМАХ ВАЛЬДЭМАРАСА НА ПАРЛЯМАНТАРЫЗМ.

«Тэл. Уніон» паведамляе, што Вальдэмарас мае намер зьліквідаваць у Літве парлямантарны ўстрой, пашырыўшы правы гандлёвай палаты, а таксама зямельнай і ўтвараючы новую палату працы. Роўным чынам будзе ўтворана вышэйшая палата з назначанымі ўрадам членамі.

Чыгунка Коўня—Вільня.

«Кур. Віл.» паведамляе, быццам літоўцы вядуць сьпешныя работы па рамонту будынкаў і чыгуначнага шляху супроць станцыі Завясы. «К. В.» прыпушчае, што Літва пад націскам Лігі Нацый змушана будзе ў хуткім часе ўзнавіць чыгуначны рух Коўня—Вільня.

У АПОШНІ ЧАС,

(Атрымана а 1-ай г. ночы).

Прысуд па справе украінскіх камуністаў.

ВАРШАВА, 13-III. Па паведамленьні польскага тэлеграфнага агенцтва, сёньня ў Львове скончыўся працэс украінскіх камуністаў. Падсудныя абвінавачваліся ў здрадзе, шпіянажы і забойстве інспэктара-папячыцеля школ паўднёва-усходняй Польшчы Сабінскага. Суд прызнаў даказаным абвінавачаньне ў здрадзе, шпіянажы і ў забойстве Сабінскага ў адносінах к падсудным Араманчуку і Вярбіцкаму. Араманчук і Вярбіцкі прыгавораны к пакараньню сьмерцю. 8 падсудных прызнаны вінаватымі ў шпіянажы і прысуджаны к зьняволеньню на тэрмін ад аднаго да двух год. Рэшта 7 падсудных апраўданы.

Правакацыя польскіх газэт.

ВАРШАВА, 13-3. Газэты паведамляюць аб арышце ў Варшаве 6 камсамольцаў як быццам на міжрэнёнай канфэрэнцыі кампартыі Заходняй Беларусі і перадаюць, быццам у часе вобыску знойдзен «Ліст Камінтэрну», у якім быццам «выказваецца незадаволеньне вынікамі выбараў, якія не апраўдалі выдаткаў, асигнаваных Камінтэрнам на выбары, між іншым, у Зах. Беларусі». «Ліст Камінтэрну» аднак трэба затуманай правакацыяй.

ПОЛЬСКАЯ КАНСТЫТУЦЫЯ І ДЗЕЙНАСЬЦЬ ГРАМАДЫ.

Сучасная польская канстытуцыя «гарантірує» на паперы ўсім сваім грамадзянам, а ў тым ліку і нацыянальным меншасьцям Польшчы поўную свабоду веры, перакананьняў слова, сходаў і г. д. Паасобным нацыянальнасьцям канстытуцыя гарантіруе нацыянальную школу, нацыянальныя арганізацыі і г. д.

Вэрсальскі трактат, які Польшча абавязалася выконваць, таксама гарантіруе польскім нацменшасьцям усе правы.

Тым часам, ня гледзячы на двойчы прынятыя на сябе абавязкі, Польшча і ня думае іх выконваць. Наадварот, Польшча як-бы знарок зьдзекуецца над сваёю канстытуцыяй і нацменшасьці ў Польшчы пазбаўлены элемэнтарных правоў. Перш усяго гэта датычыць беларусаў і ўжо потым украінцаў, яўрэяў і немцаў. Асабліва балюча польскае бяспраўе б'е беларусаў таму, што яны да апошняга часу былі найгорш з'арганізаваны і найменш нацыянальна сьвядомы, дзякуючы чаму яны не маглі ставіць польскаму ўраду такога адпору, як іншыя польскія нацменшасьці. Толькі ад часу арганізацыі «Грамады» голас беларускіх народных мас стаў гучэць больш сьмела і выразна. «Грамада», як легальная арганізацыя, спрабавала ў рамках польскай канстытуцыі пачаць шырокую культурна-асьветную і нацыянальна-палітычную працу.

Здавалася-б, чаго баяцца, калі сама канстытуцыя ўсё гэта дазваляе. Аказалася, аднак, нешта зусім іншае. За легальную працу, якая мела сваёю мэтаю правясьці ў жыцьцё канстытуцыйныя гарантыі, «Грамаду» абвінавачваюць у антыдзяржаўнай дзейнасьці.

Акт абвінавачаньня «Грамады», між іншым, гаворыць, што:

„Бел. С.-Р. Грамаду" і яе акцыю адзначала вельмі характэрная, між іншым, тактыка, а іменна: пры правядзеньні выразнай анты-дзяржаўнай акцыі, Грамада ўсюды і на кожным кроку, а ў прыватнасьці сялянскім масам агалашала, што ўсё тое, што «Бел. С.-Р. Грамада» робіць, знаходзіцца ў межах канстытуцыі і што сама арганізацыя «Бел. С.-Р. Грамады» зьяўляецца партыяй легальнай.

Такая тактыка—кажа акт абвінавачаньня—у сапраўднасьці вельмі ўдала ўплывала на абаламучаныя масы, якія, бачучы ўзрост „Грамады» і яе пры кожным выпадку маніфэставаньне сваёй сілы, не арыентаваліся ў сутнасьці справы».

Чытаючы гэтыя радкі акту абвінавачаньня, хочацца спытацца, што праступнага было ў дзейнасьці «Грамады», калі яна цьвярдзіла, што яна партыя легальная.

Польская чорная сотня і польская дэфэнзыва, якія прызвычаіліся глядзець на нашых сялян і работнікаў, як на пакорных рабоў, хлопаў, як нават на «быдла», якое можна біць і заганяць у стойла, убачыла ў „грамадаўскіх" лёзунгах і мэтадах іх распаўсюджваньня рэвалюцыю.

Звычайнае дамаганьне ад улады выконваць канстытуцыйныя гарантыі прымалася, як антыдзяржаўная дзейнасьць. Звычайны для ўсякай палітычнай партыі, якая хоча арганізаваць каля сваёй пляцформы найбольшыя масы, закліч да арганізаванасьці, да ўступленьня ў рады партыі, адміністрацыя ўзводзіла на ступень антыдзяржаўнай акцыі. Выходзіла як-бы так, што для беларусаў няма канстытуцыі, што імкненьне выкарыстаць канстытуцыю зьяўляецца антыдзяржаўным актам.

Асаблівую ўвагу акт абвінавачаньня зьвяртае на прэсу «Грамады» і сьцьвярджае, што гэтая прэса імкнулася навязаць сваім чытачом пянавісьць да польскай дзяржавы і яе ўлады. І тут мы бачым тое-ж перакручваньне фактаў. Крытыка дзейнасьці польскага ўраду і наогул польскай адміністрацыі, крыкі пратэстаў проці бязьлітасных каталітаваньняў і зьверстваў польскай адміністрацыі, проці пазбаўленьня беларускага народу ўсякіх правоў—растлумачаны ў акце абвінавачаньня, як прапаганда пянавісьці да польскай дзяржавы.

Параўнаньне жыцьця Заходняй Беларусі з тым, як вырашаны палітычныя, культурна-нацыянальныя і эканамічныя пытаньні ў СССР, таксама дае акту абвінавачаньня падставу сьцьвярджаць, што прэса «Грамады» знаходзіцца на паслугах СССР і Камінтэрну «Грамада» і яе прэса вінаваты і ў тым, што на старонках сваіх газэт яна «падкрэсьлівала сталую патрэбу адналітага фронту змаганьня з буржуазеяй, ідэалізаваны былі стасункі ў Расеі і сыстэматычна кампрамэтаваны стасункі ў польскай дзяржаве».

Аказваецца, што ў Польшчы ня можна бараніць рабочых і сялянскую беднату проці эксплёатацыі і ўціску іх капіталістамі. Права адналіта фронту ў клясавай барацьбе належыць толькі капіталу. У Польшчы можна толькі лаяць і зьдзекавацца над усім савецкім і ні ў якім выпадку ня можна гаварыць аб Саветах нічога добрага. Возьмеце любую польскую газэту і будзьце ўпэўнены, што вы знойдзеце амаль ні ў кожнай з іх самыя наглыя абвінавачаньні ў перадавіцах, у розных іншых артыкулах і заметках проці Саветаў. Аб тым, што ў нас ёсьць добрага і чаго няма ні ў Польшчы, ні можа нідзе ў сьвеце, польская прэса ўмысна маўчыць, і адна толькі папытка з боку радыкальнай беларускай прэсы прадставіць справу так, як яна ёсьць, выклікае ў хворай фантазіі і прэсы і ўралавых польскіх сфэр непамерную злосьць і потым абвінавачаньні ў залежнасьці гэтай прэсы ад СССР і Камінтэрну.

Сыстэматычныя пагромы беларускага жыцьця, штодзённыя зьдзекі і кулацкія расправы—па думцы акту абвінавачаньня—не павінны кампрамэтаваць польскай дзяржавы, а відаць—наадварот—падымаць яе прэстыж у вачох прынечаных. У такім толькі асьвятленьні беларуская прэса павінна была-б падаваць факты. Тады-б яна—накшталт прадажніцкай прэсы Паўлюкевіча і Умястоўскага, а таксама і значнай часткі польскай прэсы, як напр.: «Кур'ер Віленскі», «Слово», „Глос Правды", «Газета Поранна», «Два Грошы» і іншыя, якія толькі і ведаюць, што хваляць усё, што робіць урад, і цкуе ўсіх, хто з ім ня згодзен, —была-б пажаданай.

«Грамадзе» ставіцца ў віну, быццам яна перашкаджала працы надзелу зямлі. Справа тут вось у чым. Лепшыя землі, адабраныя ад праваслаўных цэркваў (ад касьцёлаў з прычыны пратэсту папы рымскага землі яшчэ не адабраны) і пераважна б. расейскіх памешчыкаў, аддадзены так званым асаднікам. Беларускае сялянства да апошняга часу не атрымлівала ад польскай дзяржавы ніводнага загону зямлі. Урэшце, польскі ўрад як-бы зьмілаваўся і стаў прапанаваць беларускаму сялянству рэшткі самай непрыгоднай зямлі. Беларускае сялянства падтрымлівала «Грамаду», якая ўступалася за правы нашага сялянства на лепшую зямлю і перастала браць ад казны абы што. І ў гэтым віна «Грамады».

«Грамадзе» ставіцца ў віну і тое, што яна «прымала ўдзел ва ўсіх кампаніях, якія праводзіліся на вёсцы пад кіраўніцтвам кампартыі Зах. Беларусі, напрыклад, у школьнай кампаніі, проці-падатковай і амністыйнай».

„Грамада" быццам праводзіла кампанію не плаціць падаткаў. Гэта таксама хлусьня. Справа ў тым, што амаль ні ўся Зах. Беларусь парыта на акопы і ў значнай частцы спалена і зруйнована. Польскі ўрад замест таго, каб дапамагчы адбудаваць і паправіць гаспадаркі, стаў раздаваць землі асаднікам і выдаваць ім усялякія дапамогі і натураю і грашыма для с.-г. будаўніцтва, не бяручы з асаднікаў у працягу некалькіх першых гадоў ніякіх падаткаў. Зразумела, што падобная несправядлівасьць аж занадта крыўдзіла беларускіх сялян, якія ня мелі чаго есьці, не то што плаціць падаткі. Усё гэта і выклікала з боку нашага сялянства неплацяжы падаткаў. Гэта быў пратэст проці крайняй несправядлівасьці і проці дзяржаўнага разбою, скіраванага панскай Польшчай проці беларускага сялянства. Зусім ясна, што «Грамада» не магла падтрымліваць польскі ўрад у гэтай яго агіднай акцыі.

«Грамада» праводзіла кампанію аб амністыі. Ізноў—што тут праступнага? Польскія вастрогі запруджаны палітычнымі вязьнямі звыш усякай меры. Цэлымі гадамі сядзяць там людзі, чакаючы «суда»! Іх там б'юць і катуюць. А прыдзе „суд", дык які небудзь адзін прадажны польскі шпік, якому саману месца ў вастрозе, утопіць сваімі выдуманымі паказаньнямі цэлую масу начных сялян і работнікаў. Бясконцы лік палітычных працэсаў, якія ўзьнікілі на грунце беспрацоўя і поўнага незаставаньня канстытуцыйных гарантый у адносінах да беларускіх і іншых сялян і работнікаў выклікаў па ўсёй Польшчы рух за амністыю, які падтрымліваўся і «Грамадою». Дык і ў гэтым яна вінавата.

Аказваецца, што ў «дэмакратычнай» Польшчы з яе «лібэральнай канстытуцыяй» сярмяжнаму народу цяжэй дыхаць, як нават пры цары.

Замежны.

Самаабкладаньне на дабрабыт вёскі.

На добрую справу грошы ня шкода.

І сакавіка ў нас, у вёсцы Рудня і Аронава Слабада, праводзіўся сход па самаабкладаньню. На сходзе прысутнічала 80 проц. усіх сялян вёсак Рудня і Аронава-Слабада. Сяляне прымалі актыўны ўдзел у сходзе, задавалі шмат пытаньняў, адначалі, што самаабкладаньне—справа добрая.

—Пры дапамозе самаабкладаньня мы зможам вывезьці лес на пабудову школы, адрамантаваць масты, дарогі, пашырыць амбуляторыю і інш.,—кажа селянін Раманенка.

Сход ухваліў правесьці самаабкладаньне ў разьмеры 30 проц. з сельска-гаспадарчага падатку. Грошы ад самаабкладаньня павінны быць скарыстаны выключна на патрэбу вёскі, напрыклад: адрамантаваць мост на рацэ Абалянцы, вывезьці лес для школ, пашырыць амбуляторыю, паправіць дарогі і інш.

Сяляне дзякуюць урад за гэты закон, з дапамогай якога мы зможам палепшыць дабрабыт вёскі.

Абрам Магрычоў.

Азярышчанскі райён, Віцебшчына.

Кулакі зрываюць самаабкладаньне.

Надоечы ў нас адбыўся сход беднаты, дзе быў пастаўлен даклад і праведзена гутарка аб тым, як беднаце атрымаць пазыку, як арганізавацца ў калектыў, аб карысьці самаабкладаньня. Спачатку беднота брала шчыры ўдзел у абгаварэньні гэтых пытаньняў, але ўрэшце на сход зьявілася 5 кулакоў. Яны ўзьнялі крык, вэрхал, абазвалі беднякоў лодырамі, п'яніцамі і запужалі беднякоў.

— Калі будзеце галасаваць за самаабкладаньне, то мы вам пакажам самаабкладаньне! Гэта-ж другі падатак.

І так, ня гледзячы на ўсе растлумачэньні тав. Салдаценкі, сход беднаты быў сарваны кулакамі. На кулакоў складзен пратакол. Партыйная ячэйка склікала другі сход, але ён зноў быў сарваны кулакамі.

Пасьля другой няўдачы камуніст Салдаценка зноў склікаў агульны сход, але і на гэтым сходзе кулакі выявілі сябе яшчэ больш актыўна, асабліва ранейшы „міравы" Бандарэнка, член царкоўнага савету Красьнякоў, Дорах з сынам, ды яшчэ пад іх кіраўніцтвам чалавек 5.

Пасьля гэтай няўдачы тав. Салдаценка з актывам пайшлі ў кожную хату бедняка, дзе растлумачылі аб карысьці самаабкладаньня і аб законе. Такім чынам беднату можна было арганізаваць, яна ўжо арганізаваная зьявілася на сход 2 сакавіка і, ня гледзячы на ўсе перашкоды кулакоў, як зрыў сходу, пагрозу і інш., самаабкладаньне ўсё-ж было праведзена ў 30 проц. ад падатку. На гэтыя грошы было пастаноўлена паставіць пярунавод, пабудаваць мост і грэблю на рэчцы Кроніўля, купіць грамадзкага быка і некаторыя прылады на 50 р.

Гэткая-ж барацьба была і па іншых вёсках с-савету, прычым у в. Старая Буда, Габатовічы, на пасёлку Жэжлёнка і іншых перамаглі кулакі, самаабкладаньне было сарвана. У іншых пасёлках, асабліва ў бедных самаабкладаньне прайшло з посьпехам.

Дзяніс Духвалаў.

Уваравіцкі р., Гомельшчына.

СЯЛЯНСТВА АБ САМААБКЛАДАНЬНІ І НЕДАХВАТЫ Ў ПРАЦЫ З БЕДНАТОЮ.

Пра кулацкую агітацыю.

Кацуба Максім, што жыве ў вёсцы Петрыцкім, Брагінскага райёну, на сходзе, калі разглядалася пытаньне аб самаабкладаньні, выступіў у «абарону» беднаты.

Хітра наглядаючы, як казалі сяляне, „падаямельныя" вачмі, ён казаў:

— Савецкая ўлада, кажуць, абараняе інтарэсы беднаты, на справе-ж дзяруць сем скур і з беднаты і з нас. Што-ж вам, беднякам, даюць рыбу, селядцы ці што іншае ў каапэратыве? Калі вы не ўнясеце дзесяці рублёў даю, дык вам нічога не дадуць. А дзе-ж вы возьмеце дзесяць рублёў на пай, калі ў вас няма ані кусочка хлеба? Вось вам і савецкая ўлада, вось вам і абарона інтарэсаў беднаты.

Чаму Кацуба зрабіўся на гэты дзень «абаронцам» беднаты?

А справа вельмі простая. Кацуба, як заможны, хацеў адначасна забіць двох зайцаў: папершае, сарваць кампанію па самаабкладаньню і тым самым выгарадзіць сябе ад узносу якой там дзесяткі на грамадзкія патрэбы; па-другое, схаваўшыся за бедняка, агітаваць супроць каапэрыраваньня сялянства, добра ведаючы, што каапэрыраваньне ў першую чаргу выгадна беднаце, што каапэрыраваньне дасьць магчымасьць беднаку пашыраць сваю гаспадарку. Такім чынам, Кацуба, гаворачы аб беднаце, выступаў супроць інтарэсаў беднаты, як бачым, ён выступаў ня толькі ад сябе, а ад дзесятка Кацубаў, такіх-жа заможных, як і ён.

Ці мела посьпех кулацкая агітацыя?

Правакацыя кулакоў, у асобе Кацубы, не ўдалася. Беднота зразумела, чаму на гэты дзень Кацуба стаў «абаронцам» інтарэсаў беднаты, зразумела карысьць ад самаабкладаньня, якое ў значнай меры прысьпешыць гаспадарчы рост бедняка, і дружна галасавала за самаабкладаньне на рамонт школы (400 р.) і на папраўку і пабудову мастоў (170 р.).

Не запужалі беднату і пагрозамі, якія па адрасу яе чуліся з боку заможных.

Недахваты ў працы з беднатою.

Адначасна трэба адзначыць, што беднота в. Петрыцкае не асазнае свае кіруючае ролі на вёсцы, дзеля чаго на першым сходзе выступіла неарганізована, а частка нават падалася агітацыі заможных. Патрэбна было яшчэ два разы склікаць сход беднаты, каб яе належным чынам арганізаваць, уясьніць ролю і значэньне беднаты на вёсцы, уясьніць карысьць ад самаабкладаньня. Толькі ў выніку гэтага на другім сходзе беднота выступіла арганізавана, з поўным сазнаньнем важнасьці пытаньня,

Ян сельсавет, гэтак і камітэт узаемадапамогі нічога ня робіць у сэнсе арганізацыі беднаты. А гэта стварае добрую глебу дзеля выступленьняў заможных. Побач з тым, неарганізаванасьць беднаты дае магчымасьць праводзіць у сельсавет кандыдатаў, якія дапамагаюць савецкай уладзе і беднаце, як хвораму каталь, як, напрыклад, Радчанка Аліксей, які, к нашаму агульнаму сорому, злосна выступаў супроць самаабкладаньня.

Неарганізаванасьцю беднаты я аб'ясьняю і той факт, што прыказчыкам Петрыцкага аддзяленьня Нова-Макрацкага каапэратыву зьяўляецца не бядняк, а заможны. А гэта дае сябе адчуваць. Беднота на сходзе скаржылася, што іх не бяруць у падводы для прывозкі ў аддзяленьне тавараў, ня ўпёсцы поўнасьцю пай беднякам не даюць рыбы, селядцоў і іншых тавараў, бывае часам, што бедняку, які не каапэраваны, зусім не адпускаюць тавараў.

Я ня зьбіраюся гаварыць што пагане на прыказчыка Петрыцкага аддзяленьня—магчыма ён сьлепа выконвае дырэктывы праўленьня, але я лічу, што так абходзіцца з беднатою нельга. Патрэбна, каб праўленьне каапэравала частку беднаты за кошт фонду, а другім была даддзена раскладка ўзносу паю на тры гады.

На мой погляд, у працы з беднатою неабходна трымацца наступнага:

1. Беднату склікаць ня толькі тагды, як праводзіцца якая кампанія (як гэта ў нас заўжды водзіцца), але і па пытаньнях некампанейскага характару (земляўпарадкаваньне, набыцьцё бугая, ачыстка насеньня, кантрактацыя і г. д.).

2. Выкарыстаць поўнасьцю палёгкі па каапэраваньню беднаты, абгаварыўшы гэта на сходах беднаты; праўленьням каапэрацыйных таварыстваў устанавіць сувязь з групамі беднаты, ставячы на сходах яе пытаньні каапэрацыйнага будаўніцтва.

3. Сельсаветам і камітэтам узаемадапамогі павесьці працу сярод беднаты, а РВК выпрацаваць аднаведныя ўказаньні наконт гэтага.

Адносіны серадняка.

Такім чынам мы бачым, што беднота актыўна і аднадушна выступае за самаабкладаньне. Заможны, агітуючы супроць самаабкладаньня, хаваецца за сьпіну бедняка.

Ну, а як-жа серадняк?

Найлепшым паказчыкам адносін серадняка зьяўляецца пастанова агульнага сходу вёскі Каманова. Вёска гэтая—серадняцка-бядняцкая. Заможных налічваецца толькі чатыры-пяць гаспадароў. І вось агульны сход, як нідзе, дружна галасаваў за набыцьцё пажарнае машыны, ухваліўшы для гэтага правесьці самаабкладаньне на 350 р (35 проц. к агульнай суме сельска-гаспадарчага падатку). Характэрна, што сераднякі і беднякі выступалі разам. Сьвядомасьць насельніцтва тут настолькі высокая, што заможныя не сабралі і дзесятка галасоў супроць самаабкладаньня.

Усе іншыя вёскі павінны раўняцца па Каманову. Трэба адзначыць прыхільныя адносіны да кампаніі з боку членаў сельсавету гэтае вёскі, асабліва Міхаленка Андрэя.

Паўлюк Волат.

Брагінскі р., Гомельшчына.

Як ідзе рэалізацыя пазыкі.

Лепшы сельсавет па рэалізацыі.

ГОМЕЛЬ, 14-III. *(Ад ул. кар.).* **Рудня-Нісімкавіцкі** *сельсавет, Чэчэрскага райёну, выстаўлен на конкурс, як лепшы сельсавет па рэалізацыі пазыкі.*

Сельсавет рэалізаваў аблігацый пазыкі на 700 руб., што складае 190 проц. заданьня.

Грошы ўнесены ў касу райённага выканаўчага камітэту.

Рэалізацыя пазыкі разгарнулася.

(Рагачэўскі р., Бабруйск. акр.).

Да 7 сакавіка ў райёне рэалізавана пазыкі ўзмацненьня сялянскай гаспадаркі на 21000 р. Першым па рэалізацыі пазыкі ідзе Азяранскі сельсавет, які выканаў заданьне на 45 проц. Далей ідуць—Гарадзецкі (900 р.), Курганскі (600 р.) і Ціхініцкі (300 р.) сельсаветы. Асабліва адсталі Асаўніцкі, Лучынскі, Прыборскі і Сьвяцкі сельсаветы, у якіх рэалізацыя пазыкі праходзіць зусім слаба.

Галоўнымі пакупцамі пазыкі зьяўляюцца беднякі і сераднякі. Ёсьць заможнікі, як, напр., Куркуль Адам з в. Вішчын, якія самі ня купляюць пазыкі ды яшчэ агітуюць, каб і другія ня куплялі.

Ёсьць выпадак, што бядняк і серадняк з вёскі Задруцьце супольна купілі аблігацый пазыкі на 100 р.

Асаблівую актыўнасьць у распаўсюджваньні пазыкі выяўляе настаўніцтва.

Вельмі добра прайшла падпіска на пазыку ў вайсковых часьцях, дзе агулам рэалізавана аблігацый 11000 р.

Райвыканком прымае ўсе захады, каб заданьне было выканана поўнасьцю і ў тэрмін.

Я. Савіцкі.

Дапаможам дзяржаве.

(Езярышча, Віцебск. акр.).

На агульным сходзе яўрэяў-земляробаў вёскі Аронава-Слабада адбыўся даклад аб значэньні пазыкі ўзмацненьня сялянскае гаспадаркі. Пасьля дакладу ўсе прысутныя заявілі, што яны ахвотна дапамогуць дзяржаве ў палепшаньні гаспадаркі і пастанавілі ўсім купіць аблігацыі пазыкі. Тутжа, на сходзе, прысутныя падпісаліся на 72 руб. 50 кап. і выклікаюць усіх працоўных яўрэяў зрабіць па іх прыкладу.

А. Маграчоў.

Зрываюць кампанію.

(Полацкая акруга).

У Бабыніцкім сельсавеце, Ветрынскага райёну, справа распаўсюджваньня пазыкі ўзмацненьня сялянскай гаспадаркі ідзе так, што горш і быць ня можа. Дагэтуль заданьне выканана толькі на 7 проц. З усіх контрагентаў працуюць толькі 4-5 чалавек, рэшта —бязьдзейнічаюць. За ўвесь час кампаніі праведзена ўсяго адна толькі нарада контрагентаў, на якую зьявіліся з ліку апошніх 30 проц. вылучанага складу, а астатнія і дасюль ня маюць ніякай сувязі з селькамісіямі, і што яны робяць, нікому невядома. Большасьць контрагентаў і сама сельская камісія не адчуваюць адказнасьці за работу.

Сельсавет таксама не зьвяртае ўвагі на распаўсюджваньне пазыкі. Контрагенты маўчаць, а старшыня сельсавету ня прымае захадаў да таго, каб яны сваячасова прадстаўлялі весткі аб ходзе рэалізацыі пазыкі.

Адным словам, зрываюць кампанію. Райвыканком павінен зьвярнуць на гэта пільную ўвагу.

Грамадчык.

У Гомельшчыне рэалізацыя ідзе слаба

(Ад уласч. кар-та).

Рэалізацыя пазыкі ўзмацненьня сялянскай гаспадаркі працякае слаба. З пачатку кампаніі да 8-га сакавіка па акрузе рэалізавана аблігацый пазыкі на 158264 руб., што складае 34,3 пр, заданьня. З гэтай сумы ў райёнах рэалізавана на 98629 руб., у горадзе—на 12632 руб. і ў вайсковых часьцях—на 47112 руб.

Разглядаючы асобныя райёны, трэба адзначыць, што паранейшаму вельмі слаба ідзе рэалізацыя пазыкі ў Буда-Кашалёўскім і Церахоўскім райёнах, дзе заданьне выканана толькі на 7,3 пр. Прадаўжаюць адставаць: Веткаўскі райён—выканана 9 проц. заданьня, Гомельскі—11,2 проц. і Уваравіцкі—14,7 проц. заданьня. Больш пасьпяхова ідзе рэалізацыя пазыкі ў Камарынскім райёне—заданьне выканана на 34,4 проц.

Чачэрскі райён у апошнія часы крыху падцягнуўся за 8 дзён сакавіка ў райёне рэалізавана на 1798 руб., а заданьне выканала на 29,8 проц. У Рэчыцкім райёне таксама заўважаецца ажыўленьне: за 8 дзён сакавіка рэалізавана на 3.338 руб.

У Гомелі вельмі слаба вядуць рэалізацыю пазыкі банкаўскія ўстановы. Так, аддзяленьне Дзяржбанку рэалізавала толькі на 100 руб., аддзяленьне с.-г. банку—на 450 руб., а рабочы банк—нічога. Лепш працуюць наступныя ўстановы: т-ва ўзаемнага крэдыту—рэалізавана на 1195 р., кустпрамсаюз—1200 руб., Палессаюз—1175 р. і каса ашчаднасьці АФА—2737 р. 50к.

За нядбайныя адносіны.

ГОМЕЛЬ, 14-III. (Ад ул. кар.). Веткаўскі раённы выканаўчы камітэт зьніў з працы старшыню Рудня-Шлягінскага сельсавету за нядбайныя адносіны да рэалізацыі пазыкі.

Старшыням—Тарасаўскага, Радчускага і Сьвяцілавіцкага сельсаветаў абвешчан выгавар.

Самаабкладаньне пройдзе з посьпехам.

У нашым сельсавеце праца па правядзеньню самаабкладаньня толькі распачалося. Усе вёскі сельсавету разьбіты на пункты, на якіх і адбываюцца сходы. Першыя весткі гавораць аб тым, што сяляне добра аднесьліся да самаабкладаньня:—сяляне вёсак Буракова, Жмані, Новы Двор і Барыневічы адзінагалосна пастанавілі правесьці самаабкладаньне ў ліку 35 проц. да падатку.

Цікава адзначыць, што ў гэтых вёсках ніхто з прысутных на сходзе ня выступіў супроць самаабкладаньня, а наадварот—сяляне віталі гэтае мерапрыёмства ўлады.

Першы дзень самаабкладаньня даў звыш 200 руб., а апошняе сьведчыць аб тым, што, пры дапамозе нашага вясковага актыву, кампанія па самаабкладаньню пройдзе з посьпехам.

ДЗЯДЗЬКА САМ.

В. Боркавічы, Валынецкага райёну, Полаччына.

Нядоўга кулакі весяліліся.

У п. Ясенках ня так даўна адбываўся агульны сход сялян, на якім абгаварвалася пытаньне аб самаабкладаньні. Заможныя вельмі рэзка выказваліся супроць самаабкладаньня, гаворачы, што досыць з іх іднаго падатку. Усіх выступаючых за самаабкладаньне прадстаўнікі заможных сустракалі гвалтам, так што ўрэшце самаабкладаньне было сарвана.

Вельмі здаволеныя разыходзіліся па хатах кулакі, бо адчувалі, што іх агітацыя не загінула дарэмна, але нядоўга заможным давялося весяліцца...

Праз некалькі дзён адбыўся другі сход,—беднота і сераднякі ўжо не пайшлі за заможнымі, і самаабкладаньне было прынята большасьцю галасоў у разьмеры 35 проц. да налічанага сельска-гаспадарчага падатку.

Селькор М—у.

Ясенкі, Церахаўскага райёну, Гомельшчына.

Дубоўцы першымі.

У глухім кутку Крупскага райёну, у лесе каля вялікага балота прытулілася вёска Дубавое. Вёска невялікая, усяго 37 гаспадароў. Сяляне ўсе беднякі, але ўсе добра ведаюць, каму дапамагае савецкая ўлада. Дзякуючы актыўнасьці сябра сельсавету, дэмабілізаванага чырвонаармейца тав. Бельскага Данілы, уся вёска набыла аблігацыі пазыкі ўзмацненьня сялянскай гаспадаркі. Адбыўся нядаўна сход па пытаньню аб самаабкладаньні. Сяляне праз свой вясковы актыў ужо ведалі пра закон аб самаабкладаньні. На сходзе прысутнічалі амаль што ўсе сяляне. На сходзе яны казалі:

— У нас пажарная справа кепская, шляхі і масты таксама кепскія, а ў гэтым мы самі вінаваты. У школе таксама з абсталяваньнем ня ўсё добра.

Супроць самаабкладаньня ніхто не выступаў. Аднагалосна пастанавілі правесьці самаабкладаньне.

В. Г.

Крупскі р., Аршаншчына.

ППС І КАМПАРТЫЯ ПОЛЬШЧЫ НА СОЙМАВЫХ ВЫБАРАХ.

У 1919 годзе на першых парляманцкіх выбарах у адраджонай Польшчы на выбарах да так званага «Sejmu Ustawodawczego» Польская Сацыялістычная Партыя (ППС) атрымала больш 400.000 галасоў. У 1922 г. гэтая лічба больш, чым падвоілася: ППС атрымала 906.000 галасоў—часткова ў сувязі з пашырэньнем абшару, на якім адбываліся выбары, і агульным ростам лічбы прыймаўшых удзел у выбарах, часткова-жа ў сувязі з лепшым наладжаньнем партыйнага выбарнага апарату. «Выбарнае прадпрыёмства» пэпэсаў, як назваў выбарную дзейнасьць ППС пілсудчыкаўскі «Глос Правды»,—к гэтаму году было ўжо наладжана, як сьлед. Агітатары ППС ня скупіліся ў абяцанках, а рабочая насельнасьць Польшчы яшчэ не пасьпела пераканацца ў іх сапраўднай вартасьці. Паміж іншым і ў Заходняй Беларусі ППС у 1922 годзе атрымала 92.667 галасоў і 5 мандатаў.

На толькі што адбыўшыхся соймавых выбарах ППС атрымала (па вестках «Роботніка») 1.411.000 галасоў,—на 55 проц. болей, чым у 1922 г. і правяла ў сойм 63 депутаты проціў 41 у ранейшым сойме. На першы погляд—грандыёзная перамога, якая яскрава сьведчыць аб росьце ўплываў ППС сярод працоўных месца і вёскі. Пэпэсаўскія правадыры пад сьвежым [illegible] і на [illegible] гаварыць аб выніках выбараў, як аб буйнейшай перамозе ППС. Аднак, бліжэйшы аналіз гэтае перамогі выкрывае настолькі непацешныя пэрспэктывы дзеля пэпэсаўскіх «пераможцаў», што іх бліжэйшыя сябры з пілсудчыкаўскага лягеру ня ўстрымаліся, каб не паіранізаваць над гэтаю перамогаю, выкрыць яе сапраўднае значэньне і астудзіць запал паноў-пераможцаў. У нумары за 6-Ш, «Глос Правды» так адазваўся аб пэпэсаўскай „перамозе":

„Калі справа ідзе аб ППС, дык, не зважаючы на лічбовае павялічэньне мейсц у Соймe—цяперашнія выбары выяўляюць далёка зайшоўшы крызіс гэтае заслужонае ў мінулым партыі. ППС перастае быць рабочай партыяй—вось што гаворыць вынік нядзельных выбараў. Адбываецца тое, што мы даўно прадракалі п. Недзялкоўскаму*), разглядаючы яго палітыку, якую ён праводзіць на старонках «Роботніка". ППС аддае рабочыя масы ў іншыя рукі, а сама пераходзіць на мяшчанскі і дробна-сялянскі грунт.

Сацыялісты страцілі мандаты ва ўсіх рабочых асяродках: у Варшаве, у Дамброўскім басэйне, у Любліне, у Краковўскай акрузе, у Перамышлі, Львове Узамен за гэта здабылі новыя мандаты ў земляробскіх акругах.

Што гэта значыць?

Толькі тое, што ППС, як выбарнае прадпрыемства, дзейнічае добра. Здабывае мандаты, дзе ўдасца. Калі ня можна там, дзе мела іх учора, перакідаецца на новыя абшары. Дзеля гэтага палітыкі, якія кормяцца партыйнаю працаю, захоўваюць свае дэпутацкія мандаты. Але роля ППС, як рабочае партыі, праваздае, характар яе можна зьменьваецца, а з погляду дзяржаўных інтарэсаў зьяўляецца неабходнасьць разгляду пытаньня аб яе наступніцы на рабочым грунце».

Характарыстыка пэпэсаўскіх дзеячоў і кіруемае імі партыі дадзена ў гэтым адрыўку аж надта трафная. Рабочыя раёны Польшчы ўжо добра пазналіся на пэпэсаўскім ашуканстве і пэпэсаўская агітацыя не знаходзіць у іх водгуку. Але дзеля ППС самае важнае—гэта лічба здабытых мандатаў. Перакінуўшыся на земляробскія райёны Польшчы, ППС здолела атуманіць шмат малазямельных і безьзямельных сялян і батракоў сваімі абяцанкамі, асабліва-ж там, дзе ППС раней не выступала і дзе яе ашуканчасьць шырокім працоўным масам на ўласнай практыцы яшчэ няведама. Але мандаты, здабытыя такім спосабам, не зьяўляюцца пэўным набыткам. Хутчэй якраз наадварот: пры новых выбарах ашуканства ня ўдасца, бо ашуканыя будуць ужо ведаць, з кім маюць дачыненьне, і ППС прыдзецца ізноў шукаць такіх мейсц, дзе аб ёй яшчэ мала ведаюць. Але-ж Польшча не настолькі вялікая, каб такую тактыку ППС магла ўжываць без канца. У гэтым сэнсе вельмі характэрны вынікі выбараў у Заходняй Беларусі. У 1922 годзе па трох выбарных акругах Заходняе Беларусі, дзе былі выстаўлены пэпэсаўскія сьпіскі (Пінск, Берасьце, Вільня), ППС сабрала 86.991 голас і правяла 5 дэпутатаў. Цяпер-жа ў гэтых акругах ППС атрымала 32.887 галасоў—толькі 38 проц. ранейшае лічбы і не правяла ні аднаго дэпутата, а свой адзіны мандат атрымала ў Сьвянцянскай акрузе, дзе ў 1922 г. пэпэсаўскага сьпіску ня было і дзе пэпэсаўская ашуканчасьць менш ведама. Зразумела, што і ў тых земляробскіх мясцовасьцях карэннае Польшчы, дзе цяпер пэпэсам удалося ачмуціць батракоў і бяднякоў частку сялянства, хутка пазнаюцца на сапраўднай вартасьці пэпэсаўскіх абяцанак і другі раз на іх ужо не пададуцца. Уплыў ППС у гэтых райёнах зусім пятрывалы, эфэмэрны, а раскалыханьне зямельных апэтытаў батракоў і малазямельнага сялянства толькі расчысьціць і падгатуе шлях той партыі, якая абяцае сапраўды радыкальнае вырашэньне зямельнае праблемы,—партыі камуністычнай. Трэба аддаць належнае—праніклівасьці пілсудчыкаў: яны ўжо цяпер разумеюць гэта і папераджаюць пэпэсаў, перасьцерагаючы іх ад надмернага захапленьня сваёю «перамогаю».

„Перамога, дасягнутая пераліцытаваньнем „Вызваленьня" альбо „Сялянскае партыі"—піша „Глос Правды" (за 8-3)—„што да велічыні нарэзак зямлі безьзямельным і малазямельным, ня зможа доўга вытрымаць пробу цярплівага чаканьня на выкананьне даданых абяцанак. Гэта мандаты, якіх партыя другі раз не атрымае. Затое расхістаны ашаламляючай дэмагогіяй безьзямельны альбо малазямельны дасканала падгатаваны гэтым да прыняцьця ўсякае агітацыйнае дактрыны, якая ідзе далей і перад якою павінна будзе капітуляваць ППС.".

Лёгка дагадацца, якую партыю мае тут на ўвазе пілсудчыкаўскі орган у якасьці наступніцы ППС. Такою партыяй можа быць толькі камуністычная партыя.

Посьпех кампартыі ў буйнейшых рабочых асяродках Польшчы зрабіў моцнае ўражаньне на польскія ўрадавыя сфэры і на польскую буржуазею. Усе польскія буржуазныя газэты, незалежна ад іх партыйнасьці, трывожацца аб далейшых уплывах ППС на рабочых і радзяць ёй зьвярнуць самую сурёзную ўвагу на адваяваньне рабочых масаў ад камуністаў.

Камуністычныя сьпіскі (па падліччэньню «Роботніка») атрымалі 350000 галасоў—толькі чацьвертую частку таго, што сабралі пэпэсы. Але ў параўнаньні з 1922 г. гэта дае рост на 189 проц. проці 55 проц. росту галасоў, пададзеных за ППС. У 1922 г. кампартыя правяла двух кандыдатаў, а цяпер восем, не зважаючы на страшнейшы тэрор, забарону ўсякае выбарнае агітацыі, масавыя вобыскі і арышты перад самымі выбарамі і ў часе іх, не зважаючы таксама на тое, што камуністычныя сьпіскі былі дапушчаны толькі ў 13 выбарных акругах, г. з. у аднэй толькі пятай частцы ўсяе лічбы акругаў. Пры такіх абставінах посьпех камуністаў зьяўляецца яшчэ болей яскравым і яшчэ болей трывожыць польскую буржуазею.

„Глос Правды" так выказваецца аб выбарнай дзейнасьці камуністаў (9-Ш):

«Значны рост галасоў, пададзеных за камуністаў, зьяўляецца цёмнаю плямаю на выбарах. Колькасьць галасоў, пададзеных за камуністаў у

Жыцьцё і праца асьветніка.

У пленум ЦП саюзу працаўнікоў асьветы БССР.

ГРАМАДЗКА-ПАЛІТЫЧНАЕ ВЫХАВАНЬНЕ АСЬВЕТНІКАЎ.

Пленум ЦП саюзу Белпрацасьветы канстатаваў, што сучасны нарыс (вырашэньне краінай гаспадарчых і культурных задач) патрабуюць ад нашага саюзу ў справе грамадзка-палітычнага выхаваньня асьветніцкіх мас узмацненьня кіраўніцтва ў гэтай галіне, павышэньня яго якасьці і далучэньня зьместу ў адпаведнасьці з задачамі сацыялістычнага будаўніцтва.

Пленум закрануў пытаньне аб выпадках насыўных і халатных адносін да пастановаў кі працы па палітвыхаваньню асьветнікаў з боку саюзных органаў і заклікае ўсе прафсаюзныя арганізацыі да надыцьця максімальнай актыўнасьці свайі на ажыцьцяўленьню задач палітвыхаваньня асьветнікаў. Поруч з гэтым пленум канстатаваў неабходнасьць канчатковага вынішчэньня абстрактнасьці ў працы палітвыхаваньня асьветнікаў, адначасова пленум падкрэсьліў, што ўся палітвыхаваўчая праца асьветнікаў павінна праводзіцца ў самай цеснай сувязі з бягучымі практычнымі пытаньнямі агульна-палітычнага нашага жыцьця і канкрэтнымі матар'яламі і фактамі сацыялістычнага будаўніцтва.

У галіне паглыбленьня і палепшаньня грамадзка-палітычнага выхаваньня асьветнікаў пленум вызначыў наступныя мерапрыемствы: уключыць у праграмы ўсіх летніх курсаў падрыхтоўкі асьветнікаў праграмоўку важнейшых пытаньняў ленінізму, аб чым пастаніць пытаньне перад НКА; увесьці ў сыстэму сталую праграмоўку ўсіх раменьняў партыйных, савецкіх, прафсаюзных зьездаў, і г. д.; упягнуць асьветнікаў у справу культурнага абслугоўваньня рабочых клюбаў, чытальняў, лекцыяў, дакладаў, дапамога ў самаадукацыйнай працы рабочым; больш шырока разьвіваць працу на ажыцьцяўленьню культпэфства над Чырвонай арміяй, зьвязаўшы саюзныя візавыя арганізацыі з асобнымі чырвонаармейскімі часьцямі, разгарнуць на ўсіх акругах працу шэфскіх народ пры саюзных органах; упягнуць гарадзкіх асьветнікаў у працу шэфскіх арганізацый. Сканцэнтраваць увагу шырокіх колаў асьветнікаў на неабходнасьць павялічэньня свайі актыўнасьці ў працы дабраахвотных т-ваў (МОПР, ТДА-Авіяхім і г. д.).

У галіне арганізацыі грамадзкай актыўнасьці асьветнікаў гораду пленум раіць наступнае: дапамога самаадукацыі рабочым, праца ў саютах, у прыватнасьці на лініі Саюзы Народнае Асьветы, педагагічная прапаганда сярод насельніцтва; шэфства над Чырвонай арміяй; удзельнічаньне ў кампарацыйных арганізацыях; культурная праца сярод работніц і жанок рабочых.

Канстатуючы разьвіцьцё грамадзка-культурнай працы секцыі нав. к. працаўнікоў сярод працоўных пленум указаў на неабходнасьць далейшага пугнення навук. працаўнікоў у грамадзкую працу адпаведна іх спэцыяльнасьці.

ПРАЦА СЭКЦЫІ НАВУКОВЫХ ПРАЦАЎНІКОЎ ПАЛЕПШЫЛАСЯ.

На дакладу Старшыні ЦБ СНП праф. Вольфсона, пленум адзначыў як дасягненьне ў працы СНП наступныя моманты: афармленьне секцыі як саюзнай арганізацыі, разьвіцьцё грамадзкасьці ў працы секцыі, устанаўленьне правільных узаемазадносін і сувязі секцыі з ЦП і аддзяленьняў секцыі з акр. праўленьнямі, разьвіцьцё культасьветнай працы сярод навуковых працаўнікоў палепшаньне якасьці працы ў кутку вучоных, правядзеньне сэкцыяй значнай культасьветнай працы па абслугоўваньню рабочых, сялян і асьветнікаў.

З мэтай лепшага абслугоўваньня сяброў секцыі, упягненьня ў грамадзка-палітычнае і прафсаюзнае жыцьцё шырокіх колаў навуковых працаўнікоў—пленум зьвярнуў увагу секцыі на наступныя мерапрыемствы ў далейшай працы секцыі: секцыя павінна больш заняцца пытаньнем выяўленьня прафсаюзнай лініі ў сэнсе абароны праўнага і матар'яльнага становішча сяброў секцыі. Гэтым пытаньні поруч з пытаньнямі бытавога характару, умоў працы сяброў секцыі павінны мець адбітак як у плянах працы секцыі, так і штодзённай практычнай працы.

Далей пленум даручыў секцыі і прэзыдыуму ЦП паставіць пытаньне перад закопадаўчымі ўстановамі аб выданьні палажэньня аб кватэрных і інш. льготах для навуковых працаўнікоў БССР, якімі карыстаюцца навуковыя працаўнікі іншых рэспублік. У галіне культасьветнай—пленум адзначыў неабходнасьць пашырыць працу сярод самых навук. працаўнікоў, узмацніць сувязь з шырокімі коламі асьветнікаў цераз Дом Асьветы (шляхам чытаньня лекцый, арганізацыі агульных вечароў і інш.), разгортваць і далей к-асьветвраку сярод рабочых і сялянскіх мас.

ДАСЯГНЕНЬНІ Ў ПРАЦЫ НКА.

На дакладу НКА пленум адзначыў наступныя дасягненьні: поўнае выкананьне пляну 27-28 г. па ўвядзеньню ўсеагульнага навучаньня, некаторае галяпшэньне справы на вынішчэньню нянісьменнасьці, пераход на функцыянальную сыстэму, рашучае правядзеньне рэжыму эканоміі і рацыяналізацыі, некаторае палепшэньне матар'яльнага становішча к-асьветных устаноў і працаўнікоў іх.

Разам з гэтым пленум канстатаваў: сыстэматычнае невыкананьне пляну школьнага будаўніцтва ў сувязі з неадпаведнасьцю каштарысных асыгнаваньняў рэальным запатрабаваньням і частковым скарыстаньнем будаўнічых сродкаў не па прамому іх прызначэньню, недастатковы тэмп вынішчэньня нянісьменнасьці і няўвязка яго з планам увядзеньня ўсеагульнага навучаньня, усё яшчэ слабы водпуск сродкаў на гаспадарчае і навучальнае абсталяваньне і забесьпячэньне ім к-асьветных устаноў.

На далейшы час пленум зьвярнуў увагу на актыўны ўдзел прафорганаў працасьветы па ўцягненьню мас асьветніка ў абгаварэньне сыстэмы нарасьветы, на ўцягненьне мас і ўдзел прафорганаў у распрацоўку і абгаварэньне пытаньняў 5-цігадовага перспэктыўнага пляну, найбольш хуткае заканчэньне арганізацыйнага перыяду па пераходу на функцыянальную сыстэму на мясцох, асабліва ў райёнах, узмацненьне ўвагі ў справе па вынішчэньню нянісьменнасьці як праз прыцягненьне грамадзкасьці, гэтак і шляхам арганізацыйнага і мэтадычнага кіраўніцтва і поўнае скарыстаньне адпускаемых на гэтую мэту сродкаў; зьвярнуць увагу на становішча дзіцячых дамоў і палепшыць іх, як з матар'яльнага боку, гэтак і педагагічнага.

Па дакладу з месц вынесена пэраг пастаноў дзеля палепшэньня саюзна-масавай працы.

Вывучаем комплексную сыстэму.

(Халопеніцкі райён, Меншчына).

Наша мэтадычнае аб'яднаньне пастаўнікаў Замошыскага сельсавету досыць добра тэарэтычна знаёма з сутнасьцю комплекснай сыстэмы выкладаньня, але практычна слабавата падрыхтавана да работы на комплекснай сыстэме з трыма-чатырма групамі. Па гэтаму, зразумела, нашаму маладому мэтаб'яднаньню адразу прышлося ўзяць напрамак працы—выяўленьня, абмен здабытай практыкай і г. д. Праца выяўляецца ў наступным: які-небудзь пастаўнік вядзе цэлы дзень практычныя заняткі з трыма групамі ў сваёй школе, пастаўнікі другіх школ дакнага мэтаб'яднаньня прысутнічаюць праз увесь час на заняткох. Пасьля правядзеньня практычных лекцый робіцца разбор дадзеных лекцый і ўся праца ўязвяецца з усёй мэтадычнаю працаю аб'яднаньня, гадавым і штодзённым плянам працы данае школы і ў форме таварыскага абмеркаваньня зварочваецца ўвага, як лепш праводзіць гутаркі, чытаньне, лічэньне, пісаньне; абмяркоўваюцца дасягненьні і недахопы ў працы школы і г. д.

Вельмі вялікім недахопам у працы нашага мэтаб'яднаньня зьяўляецца, тое што няма абсалютна ніякай сувязі з апорнай школай, бо ў бліжэйшай апорнай школе, з якой наша мэтаб'яднаньне павінна трымаць сувязь, вельмі дрэнна наладжана праца, і няма жаднай карысьці мець сувязь з такім «барахлом».

Бараўскі.

Пісьмо ў школе.

Старэйшыя сучасныя клясы 7-х-годкі залажылі ў цяжкія гады школы падта слабы грунт у пісаньні як з боку каліграфіі, так і з боку арфаграфіі і стылю. Выпраўляць гэтыя хібы нам прыходзіцца з вялікаю напружанасьцю. І недахоп часу ў пастаўніка для больш пільнай дапамогі вучням у гэтай справе адбіваецца на іх шкадліва: вучнёўскія спыткі, бывае, ляжаць у пастаўніка на стале па цэлых тыднях, мазоляць яму вочы і нэрвуюць яго. Гэтыя цяжкасьці больш павялічваюцца ў школах шматлюдных, дзе ў клясе бывае нават і 70 вучняў. А такіх клясаў у апошнія гады становіцца ўсё больш, бо наша сялянства цяпер так прэ ў школу, што ў ёй сьцены трашчаць.

Вось чаму, вітаючы прапановы т. Масюкевіча ў № 59 «Сав. Бел.», з свайго боку заўважаю што ў навучаньні пісьму шмат сырыце школе самастойная лябараторная распрацоўка вучнямі з пісьмовым канспектаваньнем матар'ялу. Трэба толькі гэты пісьмовы матар'ял абавязкова прапускаць праз рукі пастаўніка, які павінен дапамагаць вучням ня толькі па зьместу свае навуковае галіны, а і па формах пісьма.

Дапамога ўсяго пастаўніцкага складу выкладчыкам моў у справе пісьма ў школе—грунтоўная наша чарговая задача.

Пухавічы. **Я. Карлінскі.**

Вучнёўскае самакіраваньне ў вясковай школе.

Пытаньне самакіраўніцтва вучняў у вясковай школе стаіць досыць востра. У той час, калі ў гарадзкой школе, а таксама і ў большасьці райённых сямігодак справа з самакіраваньнем вучнёўскім пастаўлена больш-менш здавальняюча, у вясковай школе яно амаль пачало толькі разьвівацца і, праўду сказаць, носіць ня зусім правільную форму. Праўда, ёсьць кіраўнічыя органы, розныя камісіі, гурткі і г. д., здавалася-б, чаго тут болей жадаць: працуй ды і ўсё. Але на справе прыходзіцца натыкацца на такія факты, якія гавораць за тое, што справа самакіраўніцтва патанула ў розных дробязях. Санітарная, напрыклад, камісія бачыць паперку на падлозе, сачыць за тым, каб у вучняў быў твар, вушы, рукі чыстыя, але ня бачыць, як брудными нагамі топчацца вучнёўская вопратка, ня ведае, што ў сям'і таго ці іншага вучня ёсьць хворы тыфам або другою заразнаю хваробаю, ня бачыць самага галоўнага свайго ворагу і біча школы—пылу. Я не хачу гэтым сказаць, што агляд твару, рук, вушэй і інш. мною ігнаруюцца,—гэта справа таксама займае не апошняе месца ў жыцьці школы, і стаўлю не на першае месца яе ў плян працы санкамісіі толькі таму, што агляд рук і г. д. увайшло ўжо ў традыцыю, а пыл, брудны калідор, антысанітарыя навакол школьнага будынку, вядро, цэбар і самая вада астаюцца няпрыкмечанымі.

Ня лепшае зьявішча мы наглядаем і з боку гаспадарчай камісіі: тая самая павярхоўнасьць і шаблён. Калі ня так, то вельмі мала розьніца па сваёй павярхоўнасьці і шаблёну праца другіх камісій. Нічога новага, адно і тое паўтараецца з году ў год.

Дзеля таго, каб ухіліцца аднастайнасьці і каб увесьці што-небудзь новае ў школьнае жыцьцё наогул, а ў прыватнасьці ў школьнае самакіраўніцтва, мала быць разумным, здольным і нават талентавітым, а трэба мець базу, якая-б дапамагала нам патрэбную справу паставіць на належную вышыню. Гэтаю базаю, гэтым кіраўніком, без якога ніяк ня можна абыйсьціся, зьяўляецца ўсякага роду педагагічная і мэтадычная літаратура. Ці-ж мае яе вясковы настаўнік і вясковая школа? Прыходзіцца казаць, што ня мае, а калі і мае, то ўсё багацьце бібліятэкі складаецца з аднаго, двух дзесяткаў кніг. Адгэтуль ня прыходзіцца дзівіцца, што справа вучнёўскага самакіраваньня носіць вузкі, павярхоўны, шаблённы і прымітыўны характар. А жыцьцё не чакае, ідзе наперад шпаркім крокам і кожны дзень высоўвае ўсё новыя і новыя запатрабаваньні. Ясна, што ў ногу з жыцьцём, а не наўзьці ззаду, павінна ісьці і вучнёўскае самакіраваньне ў вясковай школе. Гэта пытаньне балючае, вострае. Підзе, як у вёсцы справа арганізацыі і калектывізацыі патрабуе лепшага. На вялікі жаль, трэба сказаць, што вясковая школа ў гэтым напрамку зрабіла мала і пакуль яшчэ мала робіць, а прычына — адсутнасьць належнай літаратуры. Адгэтуль вывад: школе павінен дапамагчы РВК набыць педагагічную і мэтадычную літаратуру, як часопіс «Асьвета», «Народны Вучыцель» і інш.; заняцца на пашыраных падрадах вывучэньнем школьна-вучнёўскага самакіраўніцтва; райённай інспэктуры пры наведваньні школ больш увагі зьвяртаць на гату галіну; справу самакіраваньня паставіць больш шырэй і глыбей у школах; райённым мэтбюро дапамагчы настаўніцтву ў гэтай справе шляхам практычных указаньняў.

Койданава. **Антон Лёсік.**

Ня скарга, а прашу растлумачыць.

У нас, у Беларусі, пры кожным райвыканкоме маецца пасада інспэктара народнае асьветы, у тым ліку і ў гор. Чавусах. Асабістага дзелавода інспэктар ня мае і, па маёй думцы, ён, як частка райвыканкому, павінен абслугоўвацца тэхнічным пэрсаналам служачых апошняга.

Па просьбе інспэктара, загадчык 7-хгадовае школы даў згоду, каб дзелавод 7-хгодкі дапамагаў яму ў працы па канцэлярыі, прыблізна 2 дні ў тыдзень.

Калі дзелавод 7-хгодкі быў тэрмінова занят на школьнаму перапісу, інспэктар прыслаў дзелаводу службовую запіску «зьявіцца на заняткі». Загадчык школы адказаў інспэктару, што дзелавод занят і зьявіцца да яго ня можа з прычыны вышэйпаказанай. На другі дзень дзелавод атрымаў другую службовую запіску такога зьместу: «Зараз жа зьявіцца на заняткі, у працыўным выпадку будзе пастаўлена пытаньне аб звальненьні з пасады».

Гэтай заметкай я ні на кога ня скарджуся, а толькі цікаўлюся і прашу растлумачыць вось што:

Ці працуе яшчэ хто з дзелаводаў 7-хгодкі ў інспэктара і не атрымлівае за гэта пэнсіі?

Ці павінен дзелавод 7-хгодкі наогул працаваць у інспэктара і тым больш, калі па сталай пасадзе хапае працы па ўвесь працоўны час?

Ці можа інспэктар пагражаць дзелаводу 7-хгодкі звальненьнем з пасады?

Дзелавод А. Багданаў.

Чавусы.

АД РЭДАКЦЫІ: Апроч сваёй сталай працы кожны можа працаваць, дзе хоча, але па сваёй уласнай згодзе і, пэўна, за ўзнагароду. Што-ж тычыцца грозьнага інспэктара, дык, тав. Багданаў, не п алохайцеся—саюз ёсьць, а калі (у крайнім выпадку) біць вас пачне, то ў міліцыю зьвярніцеся.

Маем гарачыя сьнеданьні ў школе.

Усім нам добра вядома, што значная частка нашых вучняў ідзе ў школу бяз сьнеданьня. На месцах прыходзіцца быць 4-5 гадзін,—зразумела, што вучні мусілі «перакусываць» сухім хлебам. Але гэта сухаядзеньне не магло задаволіць запатрабаваньняў пакрастаючых арганізмаў вучнёўскае моладзі, і пагэтаму школьныя ўрачы і пасобныя школы яшчэ ў мінулым годзе сталі прапагандаваць сярод вучняў і бацькоў іх (на сходах) думку аб арганізацыі гарачых сьнеданьняў.

У гэтым годзе ў зьвязку з правядзеньнем самаабкладаньня на культурныя патрэбы некаторым школам удалося зрабіць добры пачатак. Так, напрыклад, вопытна-практыкавальная школа пры Політэхнікуме правяла спэцыяльныя сходы бацькоў, выявіла ўсю неабходнасьць увядзеньня гарачых сьнеданьняў і бацькі вучняў ахвотна пайшлі насустрач: зрабілі самаабкладаньне ад 30 кап. да 1 руб., абралі камісію па арганізацыі сьнеданьняў, закупкі насуды і г. д. Камісія разам з загадчыкам школы горача ўзялася за справу і праз тыдзень—уся школа стала піць гарбату пасьля 3-х лекцый. Вучні прымаюць самы гарачы ўдзел па самаабслугоўваньню: растаўляюць чашкі, разьліваюць гарбату, выціраюць пасуду і г. д. Усе ажыўлены, настрой садзёры (асабліва ў першых групах). Усе клапоцяцца аб падрыманьні парадку.

Для школьнага калектыву адчыніліся яшчэ адна шырокая магчымасьць на прывіцьцю звычак, калектывізму, таварыскай уважлівасьці, прывіцьця гігіенічных звычак, што так важна пры нашай агульна-грамадзкай малакультурнасьці. І трэба сказаць, што школа (асабліва пастаўнікі малодшых груп) на прывіцьцё гэтых навыкаў у вучняў зьвярнула належную ўвагу.

Трэба спадзявацца, што ідэя гарачых сьнеданьняў скора знойдзе сваё ажыцьцяўленьне і ў іншых нашых школах, што будзе мець вялікае значэньне ў справе выхаваньня здаровага падрастаючага пакаленьня.

Грамадзкія арганізацыі і ўрачы павінны ў гэтым дапамагчы школам.

В. С.

Барысаў.

322.500 руб. на рамонт культасьветных устаноў.

Сьпета на будаўнічыя работы і капітальны рамонт культасьветных устаноў БССР па дзяржаўным бюджэце адпушчана досыць буйная сума—322.500 руб.

Нар. Кам. Асьветы ўжо разьмеркаваў гэтыя сродкі паміж падпарадкаванымі ўстановамі. Найбольш буйныя асыгнаваньні атрымалі: 93.280 руб. Беларуская Дзяржаўная Акадэмія Сельскай Гаспадаркі,—60.000 руб.—Дзяржаўны Ветэрынарны Інстытут на сканчэньне пабудовы клінікі; 16.500 руб. Магілеўскі пэдагагічны тэхнікум і 10.000 руб.—Амсьціслаўскі пэдтэхнікум. Па 8.000 руб. атрымаюць на рамонт будынкаў—Беларускі Дзяржаўны Універсытэт і Дзяржаўны Музэй і 8000 руб.—Дзяржаўны Камуністычны Універсытэт.

Нарнамасьветы даў дырэктывы, каб работы па пабудаўніцтвуі капітальным рамонце праводзіліся падрадным спосабам і толькі, калі ніхто ня згодзіцца ўзяць работы з падраду, іх можна будзе праводзіць гаспадарчым спосабам.

Вядомая рэч, што патрэба нашых культасьветных устаноў у капітальных затратах вельмі вялікая і адпушчаных сродкаў далёка недастаткова, а таму кіраўнікам устаноў неабходна пры правядзеньні будаўнічых работ імкнуцца да максімальнай ашчаднасьці.

Нар. Кам. Асьветы з прапанаваў кіраўнікам культасьветных устаноў зараз-жа распачаць падрыхтоўку да надыходзячага будаўнічага сэзону. Будаўнічыя работы павінны весьціся такім тэмпам, каб яны былі скончаны ні ў якім разе не пазьней 1-га верасьня, што дасьць магчымасьць своечасова распачаць вучэбную працу.

Прыём работ па рамонту і будаўніцтву будзе праводзіцца спэцыяльнымі камісіямі пры ўстановах з удзелам спэцыялістаў.

Маленькі фэльетон.

БЕЛАРУСІЗУЕМСЯ...

„Дзеля посьпеху украінізацыі гаварыце на украінскай мове".

З абвестак у Кіеўскім Дзяржаўным тэатры.

Прышоў адзін артыста БДТ 2 да нас у рэдакцыю ды і кажа:

...«Туды вашу туды!» Чаму вы нас ня лаеце?

— Мы абы за што ня лаем людзей, дасьціпна адказаў я.—І іншы раз, дык мы ўстрымоўваемся нават у тых выпадках, калі гэта нашых сваякоў датычыцца...

— Нас трэба лаяць!—упэўнена сказаў артыста,—бо калі і далей хваліцьмем...—сурова закрычаў ён і вочы яго наліліся крывёю.

...«Туды вашу туды!» нясьмела перабіў я абуранага артыста.

— Як вы сказалі? в павагаю да мяне перапытаўся артыста.—Будзьце ласкавы, перакажэце яшчэ!

...«Туды вашу туды!» сьмялей пераказаў я і прысасавіўся.

—«Ха-р р-ашо!» сказаў артыста і адаволены сеў, а то хваляць...—Затым, зусім супакоіўшыся артыста запытаўся:

—Наш тэатр беларускі, ці не?

—Беларускі! «Туды вашу туды»! сьмела адказаў я.

—Беларускі? перапытаўся артыста.—Гэта толькі на сцэне «беларускі», а возьмеце вы нашу гутарку па-за сцэнаю, а возьмеце вы нашу насьценную газэту, а возьмеце вы нашыя абвесткі. Вось вам для прыкладу,—і артыста перадаў мне адну з абвестак БДТ 2.—Бачыце, як мы беларусізаваліся?!—і праз хвіліну, калі я пачаў чытаць абвестку, артыста ўжо зусім падружнаму дадаў:

Ды ты,—«читай не так как пономарь,
а с чувством, с толком, с расстановкой».

... Я прачытаў.

Вось яна, гэтая абвестка з БДТ2.

ОБ'ЯВЛЕНИЕ.

Редколлегия Стенной Газеты БДТ2, просит всех работников театра, дать заметки и предстоящему выпуску очередного номера Стенгазеты.

Просьба сдать их не позже 14-га с. м. следующим тов. тов. Молчанову, Борисевич, Гитгарцу.

Редколлегия.

9-III—28 г.

Прачытаўшы гэтую абвестку і пахмурна гледзячы ў вочы артысту, я сказаў:

—І гэта называецца беларусізацыя ў сьценах БДТ2. Туды вашу растуды!..

—Ну, вось гэта я разумею, а то хваляць,—сказаў павесялеўшы артыста і выйшаў з рэдакцыі.

Алёша.

Аб працы ЦКК РСІ ў сувязі з рашэньнямі XI-га зьезду КП(б)Б і XV зьезду УсеКП(б).

(РЭЗАЛЮЦЫЯ ПЛЕНУМУ ЦКК КП(б)Б).

1. Асноўнымі і важнейшымі практычнымі задачамі для ажыцьцяўленьня рашэньняў XI зьезду КПБ і XV зьезду УсеКП(б) зьяўляецца працяг і паглыбленьне работы ЦКК НКРСІ ў напрамку:

а) барацьбы з бюракратызмам і цеганінай і бязьлітаснай крытыкі гэтых скажэньняў як у друку, так і на сходах рабочых;

б) кантролю і праверкі ажыцьцяўленьняў дырэктыў партыі і ўраду;

в) рацыяналізацыі і спрашчэньня кіраўніцтва дзяржаўнага і гаспадарчага апарату і рацыяналізацыі вытворчасьці;

г) шырокага разгортваньня рабочай, савецкай і партыйнай дэмакратыі і ўзмацненьне вылучэньства рабочых на савецкую гаспадарчую работу;

д) «ідэйнага ўзьдзейнічаньня на радавых членаў трацкісцкай апазіцыі з мэтай пераканаьня іх пры адначасовым ачышчэньні партыі ад усіх яўна несправяльных элемэнтаў трацкісцкай апазіцыі».

е) узмацненьня праверкі выкананьня дырэктыў партыі камуністымі, працуючымі ў дзяржапараце і грамадзкіх арганізацыях, у прыватнасьці выкананьня дырэктыў па нацыялітыцы.

Гэтыя асноўныя задачы, якія стаяць перад ЦКК НКРСІ, могуць быць выкананы і практычна ажыцьцёўлены толькі пры ўмове шырокага непасрэднага ўдзелу мас у работе органаў ЦКК НКРСІ, якія з гэтага часу павінны ў сваёй рабоце стаць перш за ўсё арганізатарамі рабочых мас, утвараючы кадр актывістых вакол работы ЦКК НКРСІ.

2. Адным з асноўных мерапрыемстваў барацьбы з бюракратызмам і валакітай зьяўляецца арганізацыя шырокага ўдзелу рабочых мас у барацьбе з бюракратызмам і праверцы работ дзяржаўнага і гаспадарчага апарату „праз і сумесна з існуючымі арганізацыямі рабочых і сялян, як-то: прафэсыйнымі арганізацыямі, вытворчымі нарадамі, кантрольнымі камісіямі прадпрыемстваў, фабкомамі, мясцкомамі, эканомкамісіямі, сэкцыямі саватаў, дэлегацкімі сходамі работніц і сялянак і г. д. Рабкрын павінен уцягваць рабочых ва ўсе стадыі сваёй работы, выносячы вынікі сваёй работы на абгаварэньне агульна-заводзкіх сходаў, адчыненых сходаў ячэек, клюбных сходаў і г. д.".

Неабходна ўстанавіць за правіла, каб, не абмяжоўваючыся інфармацыяй аб пасобных работах РСІ, да прапрацоўкі пасобных пытаньняў праграмы абсьледваньня РСІ прыцягваліся групы работнікаў дадзенага прадпрыемства і ўстановы, актыўна ўдзельнічаючы і дапамагаючы органам РСІ.

3. Паставіць, як адну з асноўных работ ЦКК РСІ—працяг спрашчэньня гаспадарчага, дзяржаўнага апарату і спрашчэньне, патаньшэньне і ўдасканаленьне яго кіраўніцтва, праз праверку вынікаў рацыяналізацыі дзяржаўнага і гаспадарчага апарату, дапамагаючы арганізацыі самімі ўстановамі рацыяналізатарскай работы, так як толькі гэта работа дасьць больш станоўчыя вынікі, калі яна будзе праводзіцца самымі ўстановамі.

Актуальнай задачай органаў ЦКК РСІ па праверцы ходу рацыяналізацыі прамысловасьці зьяўляецца—прыцягненьне і ўдзел у гэтай рабоце вытворчага актыву прадпрыемстваў і рабочых мас.

Усялякае заахвочваючае лепшыя ўзоры рацыяналізатарскай работы, неабходна пераносіць іх на другія прадпрыемствы і ўстановы і ў той-жа час арганізаваць заахвочваньне грамадзкай крытыкі, выкрыцьцё ўсяго адмоўнага ў гэтай рабоце.

У мэтах узмацненьня барацьбы з бюракратызмам, паскарэньня расьсьледваньня і разгляду скаргаў на зьявішчы бюракратызму і валакіты ў дзяржаўным, гаспадарчым апараце і грамадзкіх арганізацыях і на няўважлівыя і нядбайныя адносіны службовых асоб да запытаньняў працоўных, а таксама ў мэтах арганізацыі ўдзелу ў расьсьледваньні і разборы скаргаў рабочых,—рэарганізаваць работы Бюро Скаргаў НКРСІ такім чынам, каб:

а] да расьсьледваньняў прыцягваліся масавыя рабочыя арганізацыі (кам'ячэйкі, прафсаюзы, камсамол, сэкцыі саветаў, рабкоры, сялянскія камітэты ўзаемаданамогі, групы беднаты, дэлегацкія сходы работніц і сялянак, рэвізійныя камісіі);

б) для разгляду выяўленых расьсьледваньнем ненармальнасьцяў, бюракратызму, валакіты, нядбайных адносін да запытаньняў працоўных,—арганізаваць разбор спраў у Бюро Скаргаў НКРСІ з удзелам абраных на агульных сходах фабрык і заводаў—рабочых засядацеляў.

Найбольш злосныя і паказальныя справы разглядваць на фабрычна-заводзкіх сходах і ў клюбах;

в) Бюро Скаргаў у сваёй рабоце павінна вучыцца: высуноўшыхся і праявіўшых сябе на рабоце на грамадзкаму кантролю над работай савецкага апарату, у мэтах вылучэньня іх; а таксама пэрыдычна вывучаць матар'ялы Бюро Скаргаў па пасобных установах, з мэтай вывучэньня недахопаў суадпаведнай установы і намячэньне правільнай арганізацыі і работ яго;

г) адначасова Бюро Скаргаў павінна арганізаваць прыцягненьне ўсіх членаў ЦКК і пасобных засядацеляў, шырокае асьвятленьне сваёй работы перад шырокімі рабочымі і сялянскімі масамі праз даклады на сходах і праз друк, бязьлітасна выкрываць «не взирая на лица» выяўленых бюракратаў, валакітчыкаў і нядбайна адносячыхся да запытаньняў працоўных;

д) для пашырэньня работ па разбору скаргаў арганізаваць у акругах пры ўпаўнаважаных НКРСІ Бюро Скаргаў, пры чым кіраўніцтва Бюро Скаргаў акругі павінна быць усклядзена на аднаго з членаў АКК, пастаянна працуючых у апараце АКК;

е) як вопыт, увесьці вылучэньне пры некаторых райённых Выканаўчых Камітэтах—Упаўнаважанага Акруговага Бюро Скаргаў РСІ, абіраемага Райённым Выканаўчым Камітэтам для прыёму скаргаў і расьсьледваньня іх.

5. Кантроль і праверка выкананьня дырэктыў партыі і ўраду павінны быць узмоцнены, як адна з важнейшых мер, дапамагаючая своечасовану іх выкананьню. РСІ павінна ўзяць ініцыятыву і садзейнічаць арганізацыі ў установах і прадпрыемствах самакантролю і праверкі.

Лічыць неабходным прыступіць безадкладна да сыстэматычнай праверкі выкананьня савецкімі арганізацыямі дырэктыў партыі і ўраду «сіламі рабочых, абіраемых заводзкімі сходамі і вазглаўляемых і інструктыруемых работнікамі Рабкрына» [рэз. XV Зьезду].

Пленум даручае Прэзыдыуму распрацаваць і аформіць праз кіруючыя савецкія органы пытаньне аб забесьпячэньні магчымасьці прыцягненьня рабочых да гэтай работы, прыкладна, дапасоўваючы гэта да ўмоў работы членаў Гарсавету.

6. Выходзячы з таго, што посьпех у барацьбе з бюракратычнымі скажэньнямі дзяржаўнага і гаспадарчага апарату будзе залежыць ад актыўнага ўдзелу рабочых і сялянскіх мас у справе савецкага будаўніцтва,—пленум ЦКК КП(б)Б адной з важнейшых мер да ажыцьцяўленьня гэтай задачы лічыць правядзеньне і пашырэньне рабочай, савецкай і партыйнай дэмакратыі. ЦКК-НКРСІ павінен паставіць сваёй задачай сыстэматычную праверку яе ажыцьцяўленьня, барацьбу з усімі перашкодамі, як яна парушаюць дэмакратыю і бязьлітаснае выкрыцьцё арганізацыяў і асоб, парушаючых яе; у прыватнасьці неабходна весьці рашучую барацьбу з праявамі прасьледваньня за крытыку дзеяньняў службовых асоб і работнікаў.

Адначасова паставіць задачай, каб пры практычных абсьледваньнях работах улічваліся тыя рабочыя і сяляне, якія праяўляюць актыўнасьць і здольнасьць, у мэтах іх вылучэньня на пастаянную работу ў грамадзкім і савецкім апараце, а таксама весьці бязьлітасную барацьбу і прасьледваньне няўважлівых і бюракратычных адносін да вылучэнцаў, усімі мерамі дабіваючыся далейшых посьпехаў сапраўднага арабочаньня савецкага і гаспадарчага апарату.

7. Пленум ЦКК ухваляе перагляд прэзыдыумам пляну працы ЦКК-НКРСІ БССР у напрамку суадпаведнасьці з пастановамі XV Партзьезду і заданьнямі ЦКК-РСІ СССР, у прыватнасьці—прыняцьця мерапрыемстваў па зьніжэньню сабекошту будаўніцтва, пытаньняў капітальнага будаўніцтва і інш.

8. У мэтах большага асьвятленьня работ ЦКК-НКРСІ перад шырокімі рабочымі масамі,—узмацніць мерапрыемствы па асьвятленьню работы ў друку і ў дакладах на сходах рабочых, адчыненых партсходах, увёўшы за правіла, што ні адна работа НК-РСІ не павінна пачынацца і заканчвацца без суадпаведных дакладаў на сходах і без неабходнага асьвятленьня ў друку.

9. Улічваючы, што друк, як арганізатар грамадзкага заданьня, займае значнае месца ў барацьбе з бюракратызмам, неабходна ў больш шырокім маштабе скарыстаць друк для правядзеньня грамадзкай праверкі выкананьня дырэктыў, а таксама бязьлітаснага выкрыцьця ўсіх ненармальнасьцяў і скажэньняў дзяржаўнага апарату, асьвятляючы ў друку лепшыя прыклады работ, у мэтах перанясеньня вопыту на іншыя органы.

10. XV-ы Зьезд УсеКП(б) абавязаў „прывязць усе меры ідэйнага ўзьдзейнічаньня на радавых членаў трацкісцкай апазіцыі, з мэтай іх пераканаьня", аднак, гэтыя мерапрыемствы пасобнымі арганізацыямі КП(б) Бел. у недастатковай меры праводзяцца.

Пленум ЦКК КП(б)Бел. абавязвае АКК і мясцовыя парт. камітэты ўзмацніць работу на ідэйваму ўзьдзейнічаньню і перавыхаваньню радавых членаў партыі, уцягнутых у трацкісцкую апазіцыю і толькі несправямых элемэнтаў з іх выключаць з партыі.

11. Адным з важных пытаньняў у справе практычнага праламленьня задач, якія паставлены зьездамі перад органамі КК-РСІ,—зьяўляецца больш глыбокае і сур'ёзнае ўсваеньне ўсёй партарганізацыяй рашэньняў партыі ў галіне работы КК-РСІ, таму неабходна правесьці праверку практыкі мэтадаў вывучэньня ў яячэйках рашэньняў зьездаў, а таксама пастаноў ЦКК КП(б)Б.

12. Адзначаючы балючыя зьявішчы ў партарганізацыі, рост п'янства і ўчыненьня рэлігійных абрадаў,—пленум ЦКК КП(б)Б даручае ўсім АКК весьці самую рашучую барацьбу супроць партпрастулкаў членаў партыі.

ЯК РАСПАЎСЮДЖВАЮЦЦА КНІЖКІ І ГАЗЭТЫ.

Сярод іншых сродкаў змаганьня з цемрай і некультурнасьцю насельніцтва, сярод іншых сродкаў барацьбы за культурную рэвалюцыю, як школа, хата-чытальня, курсы, лекцыі і інш. кніжка і газэта займаюць, калі і ня самае першае—дык ува ўсякім выпадку адно з першых месц.

Тэмай нашага артыкулу мы і возьмем справу распаўсюджваньня кніжок і газэт, якую мы і пастараемся высьветліць больш-менш падрабязна, наколькі гэта магчыма ў межах газэтнага артыкулу.

Разгледзім, папершае, пытаньне аб тым, што зроблена; а потым ужо пройдзем да пытаньня—што яшчэ трэба зрабіць.

Агульны адказ на першае запытаньне—што зроблена ў сэнсе распаўсюджваньня кніжкі і газэты сярод мас—можна даць толькі адзін—зроблена яшчэ вельмі мела. У гэтай галіне яшчэ шмат непачатай працы.

Распаўсюджваньнем кніжок у межах БССР займаюцца наступныя арганізацыі: Белдзяржвыдавецтва, Дзяржвыдавецтва РСФСР, Белкаапсаюз, Таварыства «Кніга—вёсцы», «Палесдрук» і Контрагенцтва друку. Зазвалася-б, што для тэрыторыі БССР колькасьць кніганганлюючых арганізацый зьяўляецца вусім выстарчальнай, роўным чынам і досыць выстарчальнай павінна быць прызнана і колькасьць кніганганлюючых пунктаў на вёсцы і ў райёнах, якая да бягучага году дасягнула лічбы 437, проці 63 у 1924-25 годзе. Але калі мы ад колькасьці пяройдзем да ацэнкі якасьці работы гэтых кніганганлюючых пунктаў—дык убачым вусім іншае. Адносна расейскіх кніжок мы маем такія лічбы: усяго іх было прададзена ў 1925-26 г. на суму 540.483 руб., а ў 1926-27 г. сума гэта ўжо павялічылася да 593.303 р., г. зн. на 10 проц. У гэтыя лічбы

500 руб. прэміі. КАНТОРА ГАЗЭТЫ **„САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ“** ОРГАН ЦВК БССР **500 руб. прэміі.**

да дню друку—5 мая абвяшчае КОНКУРС:

а) НА ЛЕПШЫ МЯСЦКОМ і ГРУПКОМ ПРАЦАЎНІКОЎ АСЬВЕТЫ ў справе распаўсюджаньня газэты „Савецкая Беларусь“.
б) НА ЛЕПШАГА ЎПАЎНАВАЖАНАГА, ВЫЛУЧАНАГА МЯСЦКОМАМ І ГРУПКОМАМ ПРАЦАЎНІКОЎ АСЬВЕТЫ па збору падпіскі і распаўсюджаньня газэты „Савецкая Беларусь“.

Хто зьбярэ большы лік падпішчыкаў на газэту, той атрымае ГРАШОВУЮ ПРЭМІЮ:

Першая прэмія мясцкому—60 руб., упаўнаважанаму—75 р.	Чацьвертая прэмія мясцкому—20 руб., упаўнаваж.—40 р.	Сёмая прэмія ўпаўнаважанаму . . . 15 руб.
Другая „ „ 50 „ „ 60 „	Пятая „ „ 20 „ „ 30 „	Восьмая „ „ . . . 10 „
Трэцяя „ „ 35 „ „ 50 „	Шостая — — — „ 25 „	Дзевятая „ „ . . . 10 „

Конкурс будзе цягнуцца 2 месяцы (падпіску праводзіць у працягу красавіка і мая). З 1-га мая заканчваецца прыём ведамасьцяў на конкурс. ВЫНІКІ КОНКУРСУ БУДУЦЬ АБВЕШЧАНЫ Ў ДЗЕНЬ ДРУКУ—5-га МАЯ.
УВАГА; а) Пры вызначэньні прэміі будзе прынята пад увагу ня толькі колькасьць падпішчыкаў, але і тэрмін падпіскі. КРЭДЫТНАЯ ПАДПІСКА ДАЕ ТЫЯ-Ж ПРАВЫ НА КОНКУРС, ЯК І ПАДПІСКА ЗА НАЛІЧНЫ РАЗРАХУНАК.
б) Ведамасьці па збору падпіскі на конкурс, якія пасылаюць у Кантору газэты ўпаўнаважаныя, павінны быць засьведчаны мясцкомам. Падпіску на конкурс можна зьбіраць ня толькі сярод асьветнікаў, але і сярод іншага жыхарства.
КОНКУРСНЫ КАМІТЭТ вызначан у наступным складзе: СТАРШЫНЯ—Тав. КУДЗЕЛЬКА (ЧАРОТ), адказны рэдактар газэты „Савецкая Беларусь“. ЧЛЕНЫ: Тав. Баліцкі (Нарком Асьветы); т.т. Платун і Мельнік (ад ЦП Саюзу Прац. Асьветы); тав. Сяньковіч (Заг. Аддз. Друку ЦК КП(б)Б); тав. Камлюк (Рэдактар аддзелу „Жыцьцё і Праца Асьветн.“); тав. Касьцюк (Загадчык Канторы газ. „Савецкая Беларусь“). КОНКУРСНЫ КАМІТЭТ.

БЕЛАРУСКІ СТУДЭНТ.

5-я ўсебеларуская канфэрэнцыя пралетарскага студэнцтва.

12-га сакавіка зачынілася 5-я ўсебеларуская канфэрэнцыя пралетарскага студэнцтва, якая цягнулася 3 дні. Па канфэрэнцыі прысутнічалі прадстаўнікі ўсіх ВНУ, рабфакаў, тэхнікумаў і савпартшкол, усяго прысутнічала каля 100 делегатаў.

На першым пасяджэньні выступіў т. Кнорын з вялікім дакладам аб культурнай рэвалюцыі і задачах студэнцтва. Тав. Кнорын у сваім дакладзе спыніўся на задачах культурнай рэвалюцыі, без якой мы ня можам шпарка будаваць новую сацыялістычную грамаду. Да гэтага часу мы назіраем, што спэцыялісты ня маюць жаданьня працаваць у вёсцы, дзе яны асабліва патрэбны. Задача пралетарскага студэнта накіраваца для працы ў вёску, каб хутчэй зьнішчыць культурны разрыў паміж горадам і вёскай.

Другой задачай студэнцтва, на якую зьвярнуў увагу тав. Кнорын, зьяўляецца падрыхтоўка ўВНУ і тэхнікумах кадраў высокакваліфікаваных спэцыялістаў, якія добра знаёмы з сваёй краінай, усімі яе асаблівасьцямі, мовай шырокіх мас, культурай, эканомікай і г. д. пры адначасовым аўладаньні марксыцка-ленінскім мэтадам.

Далей тав. Кнорын спыніўся на тым, што пралетарскае студэнцтва павінна прымаць больш актыўны ўдзел у грамадзкай працы.

Нарэшце, тав. Кнорын спыніўся на пытаньнях быту, на неабходнасьці барацьбы за здаровы культурны быт

Па дакладу тав. Кнорына канфэрэнцыя вынесла пастанову і зьвярнулася да ўсяго студэнцтва з заклікам пашырыць грамадзкую культурную работу сярод працоўных мас, адначасова пашырыць культурную работу сярод самога студэнцтва.

5-я канфэрэнцыя заслухала даклады ЦБ Пралетстуду ЎсеЦСПС, ЦБ Пралетстуду ЦСПСБ і Наркамасьветы Беларусі.

Нам. Нар. Кам. Асьветы т. Валасэвіч у сваім дакладзе застанавіўся на неабходнасьці ў бліжэйшы час стабілізацыі сеткі прафэсыйных навуч. устаноў, у выніку чаго апошняя, мажліва, будзе некалькі скарочана, пры адначасовым пашырэньні пэдагагічнай асьветы.

Акадэмічная пасьпяховасьць узрасла, але далёка недастаткова: неабходна зьвяшчыць хібы ў разьмеркаваньні стыпэндый; неабходна цьвёрдая класавая лінія; неабходна дамагацца палепшаньня матар'яльнага становішча студэнцтву.

Па ўсіх дакладах адбыліся шырокія спрэчкі.

Дрэнна стаіць справа з беларусізацыяй; значная частка настаўнікаў тэхнікумаў не перайшла яшчэ да выкладаньня на беларускай мове; ёсьць значны лік навуковых працаўнікоў, асабліва ў тэхнікумах, якія не адпавядаюць свайму прызначэньню.

Канфэрэнцыя прыняла рэзалюцыю пратэсту супроць суду над Белар. Грамадой, а таксама пастанавіла паслаць прывітальныя тэлеграмы ЦК ЎсеКП(б), ЦК КПБ(б), ЎсеЦСПС і ЦСПСБ.

Перад новым саладам ЦБ Пралетарскага Студэнцтва канфэрэнцыя паставіла наступныя задачы: далейшае павышэньне акадэмічнай пасьпяховасьці, узмацненьне палітычнага выхаваньня студэнцтва, пашырэньне сувязі студ-ва з працоўнымі масамі і вытворчасьцю, пашырэньне ваенізацыі, неабходнасьць павесьці рашучую барацьбу за здаровы быт і няўхільна дабівацца палепшаньня матар'яльнага становішча студэнцтва.

Львовіч.

Калі БДУ загаворыць пабеларуску?

Вазьмем справаздачу праўленьня БДУ, справаздачу рэктара ці дэкана і вы там знойдзеце заўсёды, што унівэрсытэт у цэлым і дэканаты беларусізаваны на 50 процантаў, а то і на больш.

Тут вы знойдзеце, што і лекцыі чытаюцца на беларускай мове, і сэмінары вядуцца і шмат што іншае вядзецца. Гэта так: ёсьць і лекцыі, ёсьць і сэмінары. Наколькі яны ёсьць—гэта пытаньне другое. Але досыць таго, што нешта ёсьць. Сёньня мы аб гэтым гаварыць ня будзем, пакінуўшы на наступны раз.

Гэты раз нагаворым, наколькі мы чуем беларускую мову ў сьценах унівэрсытэту. Ня будзем гаварыць аб тым, ці чуваць беларуская мова ў гутарцы паміж студэнтамі, бо няма аб чым гаварыць. Пагаворым аб тым, ці чутна яна на агульных сходах студэнтаў, на справаздачах дэканатаў; калі гаварыць аб мэдфаку і факультэце права і гаспадаркі, дык мы беларускую мову на сходах і справаздачах чуем выпадкова. Так, на агульным сходзе студэнтаў правоваў 29 лютага гэтага году толькі выступленьне аднаго студэнта было на беларускай мове, а даклад дэкана, С. Я. Вольфсона, студэнцкіх арганізацый і ўсіх студэнтаў былі на расейскай мове.

Вывадаў непатрэбна. Факты гаворань самі за сябе.

Але адзін факт можа выклікаць другі. У БДУ мы гэта наглядзем. 4 сакавіка гэтага году ў актавай залі БДУ разглядалася судовая справа па абвінавачаньні студэнта III курсу пэдфаку Шулякоўскага ў растрасе грамадзкіх грошай. І што-ж мы чулі? А чулі тое, што ўвесь судовы працэс вёўся на расейскай мове. Абвінаваўчае заключэньне было напісана на расейскай мове, нарсудзьдзя гаварыў на расейскай мове, пракурор—на расейскай, праваабаронца—таксама. Толькі два грамадзкія абвінаваўцы гаварылі на беларускай мове.

Чытач можа зьдзівіцца: пры чым тут унівэрсытэт, беларуская мова і судовы працэс? А вось пры чым.

Абвінаваўчае заключэньне пісаў сьледчы акрпракуратуры т. Дворкіна, якая скончыла факультэт грамадзкіх навук Беларускага дзяржаўнага унівэрсытэту, пракурор з акрпракуратуры т. Розэнблюм таксама скончыў факультэт грамадзкіх навук БДУ, праваабаронца—таксама, нарсудзьдзя І вучастку гор Менску т. Сільнінаў зараз зьяўляецца студэнтам 2 курсу факультэту права і гаспадаркі БДУ; злачынца быў студэнтам пэдфаку БДУ—беларус.

Вывадаў і тут рабіць ня трэба. Факт гаворыць сам за сябе. Але толькі прыходзіцца задаць запытаньне: калі-ж хоць на сходах, ня кажучы ўжо пра лекцыі, студэнцтва загаворыць на беларускай мове? Аб прафэсуры не кажу, бо дзе там ёй, ведаючы па якіх пяць чужаземных моваў, займацца беларускай!

А ў справаздачы будзе: „Прафэсура беларусізуецца“.

А. Прылуцкі.

Слова—скончаўшаму пэдфак БДУ.

(Ст. «Красное»).

Шмат студэнтаў, скончыўшых Пэдфак БДУ, зазначаюць, што мэтадычная падрыхтоўка, якая даецца Пэдфакам, ня вусім дастаткова. Тым таварышам, якія да паступленьня на Пэдфак ужо працавалі ў школе, пасьля сканчэньня Пэдфаку арыентаваца лёгка. У значна горшае становішча попадаюць тыя, якія з практычнай пэдагагічнай працай сустракаюцца на сканчэньні Пэфаку ў першы раз. Звычайна, студэнт за 4 гады на стажыраваньне ў школе аддаваў якіх-небудзь 4 тыдні і даваў толькі 1 практычны урок. Гэта, бязумоўна, мала. Студэнт павінен добра азнаёміцца з сутнасьцю таго ці іншага мэтаду, з яго прымяненьнем на практыцы. Адзін-ка урок нічога дань ня можа. Сюды трэба дадаць і наступнае.

Як вядома, па кожнай дысцыпліне існуе шмат падручнікаў. Лік іх павялічваецца, асабліва пры лябараторнай прапрацоўцы матар'ялу. Студэнт, не знаёмы добра са зьместам школьных падручнікаў, ня ведаючы разьмеркаваньня ў іх матар'ялаў, спачатку ня ведае, як узяцца. Лябараторныя заняткі амаль немагчыма праводзіць. Гэта прымушае скончыўшага Пэдфак карыстацца спачатку лекцыйным мэтадам замест таго, каб прынесьці ў школу новыя мэтады.

Таксама студэнт не атрымоўвае надежных ведаў у галіне рацыяналізацыі працы ў школе, між тым, як на гэта трэба зьвярнуць асаблівую ўвагу. Вельмі карысная дысцыпліна—псыхотэхніка да гэтага часу не зьяўлялася для студэнтаў абавязковай дысцыплінай. Здаецца, што псыхотэхніка ў сучасны момант павінна заняць пачэснае месца ў шэрагу іншых абавязковых дысцыплін.

На мясцох не хапае выкладчыкаў фізкультуры. У некаторых школах фізвых, за адсутнасьцю кіраўнікоў, зусім не выкладаецца, а часам даручаецца непадрыхтаваным да гэтага асобам. Пэдфак-жа ў гэтым напрамку рабіў да гэтага часу мала. Існуе толькі спартыўны гурток і то на сродкі Выканбюро студэнтаў, якое пры абмяжованасьці сродкаў ня можа ахапіць гурткам значнага ліку студэнтаў, бо добрая праца гуртка патрабуе больш значных выдаткаў. Каб пэдфакаўцы маглі атрымаць падрыхтоўку па фізвыху, спачатку трэба было-б зьвярнуць асаблівую увагу на спартыўны гурток і, узгадніўшы пытаньне з ВСФК, пабудаваць праграму гуртка так, каб гурток на працягу працы ў ім даў студэнту магчымасьць у далейшым выкладаць фізвых у школе.

Вось некаторыя меркаваньні адносна тых пытаньняў, на якія трэба зьвярнуць Пэдфаку ўвагу.

Н. В—ч.

ПЕРАД БУДАЎНІЧЫМ СЭЗОНАМ.

Выраб абадоў і дугаў.

У сёлетні будаўнічы сэзон ВСНГБ будзе будаваць у Бабруйшчыне завод па вырабу абадоў для калёс, дугаў і іншых прыладаў сялянскай абознай гаспадаркі. Пабудоўка заводу будзе закончана сёлета.

2.300.000 зарплаты,

наводле арыентыровучых падлікаў ВСНГБ па прамысловым будаўніцтве ў сёлетнім годзе будзе выкарыстана 600.000 чалавека-дзён. Чатырох тысячам кваліфікаваных і чорнарабочых будаўнікоў мяркуецца выплаціць у якасьці зарплаты 2.300.000 руб.

«Белгосстрой» ужо пачаў будаўніцтва.

„Белгосстрой“ пачаў будаўнічыя работы. Каля 100 фурманак развозяць будаўнічыя матар'ялы на месцы пабудовак. Распачалася праца па пабудове унівэрсытэцкага гарадка. Сёлета будзе закончана 6 карпусоў. На гэту працу будзе расходавана 2 з паловай мілёны рублёў.

Будаўніцтва унівэрсытэцкага гарадка будзе скончана ў 1929 годзе і абыдзецца 4.800.000 руб.

Мэханізацыя зьнізіць кошт будаўніцтва.

«Белгосстрой» мэханізуе будаўнічыя работы. З-за межаў выпісаны наступныя машыны: станкі для рэзкі і згінаньня арматуры, 10 штук мяшалак для бэтону і інш. растворaў, станок для ачысткі старых дошчак, пнэўматычныя машыны для афарбоўваньня будынкаў і інш.

На ўсіх буйных работах падвоз матар'яраў і машын будзе рабіцца па вузкакалейцы. Мэханізацыя шмат зьнізіць кошт будаўніцтва.

Завод для вырабу журавінага экстракту.

ВСНГБ падаў на зацьверджаньне Эканамічнай Нарады праэкт заводу для вырабу экстракту з журавінаў. Пры дзьвёхзьменнай працы завод у суткі будзе вырабляць да 1.000 кілёграмаў экстракту. Прадукцыя заводу пашырыць кантынгент рэчаў другараднага экспорту.

Арганізуецца вытворчасьць мэблі.

Завод «Двинолеса» № 2, які да гэтага часу не працаваў, пастановай Эканамічнай Нарады перадаецца ў веданьне камунальнага трэсту Віцебскага АВК з тым, каб там была арганізавана вытворчасьць мэблі ды іншых сталярных рэчаў.

У хуткім часе гэта пытаньне канчаткова будзе вырашана ў ВСНГ СССР.

Хроніка.

Беларускі камсамол—у госьці да балтфлётцаў.

Да сьвята 18-га сакавіка ад усіх акругаў БССР выедуць у Ленінград камсамольскія дэлегацыі ў госьці да падшэфных маракоў.

Камсамольцы і беспартыйная моладзь пасылаюць падшэфнікам падарункі.

Падрыхтоўка да сьвяткаваньня 18-га сакавіка.

Па ўсіх яячэйках Мопр'у вядзецца шырокая праца на падрыхтоўцы да сьвяткаваньня 18-га сакавіка—дню Парыскай Камуны. У часе сьвята ў горадзе і раёнах адбудзецца скарбоначны збор на дапамогу палітвязьням Заходняй Беларусі і Польшчы. У горадзе адбудзецца вялікі карнавал.

Усебеларускі зьезд камітэтаў сялянскай узаемадапамогі.

Сёньня ў клюбе акрвыканкому адчыняецца 5-ты ўсебеларускі зьезд камітэтаў сялянскай узаемадапамогі. У працах зьезду прымуць удзел звыш 200 делегатаў ад райённых і сельскіх камітэтаў узаемадапамогі.

На зьезд чакаюцца прадстаўнікі ЦК камітэтаў узаемадапамогі РСФСР, Украіны і Закаўказьля.

На 850.000 руб. скураных тавараў.

Усесаюзны скурсындыкат разьмеркаваў фонд скураных тавараў на сакавік паміж сваімі канторамі. Згодна гэтага разьмеркаваньня, Беларуская Кантора Усесаюзнага Сьурсындыкату атрымае скураных тавараў на 850.000 руб.

Спажывецкая кааперацыя загатовіць экспортнай сыравіны на 1.000.000 руб.

На апошнім пасяджэньні праўленьня Белкаапсаюзу абгаварваўся гадавы план загатоўкі экспортнай сыравіны. Плян зацьверджан у суме 1.000.000 руб. Да загатоўкі экспортнай сыравіны прыцягнута ўся сыстэма спажывецкай кааперацыі.

16.000 руб. на рамонт Беладзяржтэатру.

На рамонт будынку Беларускага Дзяржаўнага Тэатру асигнавана на дзяржаўным бюджэце 16.000 руб.

Пасылка хворых студэнтаў на курорты.

Студэнцкія арганізацыі унівэрсытэту праводзяць абсьледаваньне хворых студэнтаў для пасылкі апошніх у бягучым годзе на курорты. Усяго будзе паслана на курорты 60 студэнтаў БДУ.

ЗДАРЭНЬНІ.

Пакража у тэатры.

9 сакавіка раптоўна нагас сьвет у разьдзявальні БДТ. У гэты момант шайка зладзеяў прыняліся за «чыстку» кішэняў. У выніку—у гр-на Хаіма Ас было ўкрадзена 600 руб. грошай. У іншых гр-н зроблены больш дробныя пакражы.

Вудачна закінена няўдачна.

Загадчык гаспадаркі Цэнтр. Рабочай Амбуляторыі гр-н Левін, атрымаўшы ў Камунальным банку 2.000 руб., зайшоў ва ўнівэрсальны магазын ЦРК. Тут невядомы злачынца разрэзаў Левіну партфэль, але грошай выцягнуць не насьмеў. Хто хацеў зрабіць пакражу, непадома, бо Левін яго не заўважыў.

Далейшае ўпарадкаваньне Менскай Біржы Працы.

За апошні час на Менскай Біржы Працы ўнесены некаторыя палепшаньні ў галіне абслугоўваньня беспрацоўных.

Адным з найбольш хваравітых пытаньняў у беспрацоўных, бязумоўна, зьяўляецца пытаньне аб г. зв. «нўках», нарэшты-чных рэгістрацыях. Для таго, каб ня быць зьнятым з вучоту Біржы Працы, а таксама для таго, каб сваячасова атрымаць дапамогу ад Страхкасы неабходна, каб беспрацоўны ў вызначаны час рэгістраваўся на Біржы. Але тут беспрацоўнаму прыходзілася марнаваць шмат часу. Прыходзілася затрымліваць беспрацоўнага, пакуль адшукаюць яго картку, і іншы раз, калі яе не знаходзілі, наноса рабілі рэгістрацыю.

Тое-ж самае было і з дняміі яўкі. Біржа ня мела пэўнага каляндарнага рэгістрацыйнага пляну.

Па ініцыятыве Эканомкамісіі пры Наркампрацы ўсе гэтыя дэфэкты зьвяшчаны наступным чынам:

Калі беспрацоўны ўпяршыню рэгіструецца, ён атрымлівае талён, у якім зьмешчаны неабходныя кароткія весткі аб беспрацоўным, а таксама сталы нумар яго рэгістрацыйнае карткі. Гэта дае магчымасьць пры яўцы хутка адшукаць картку. На гэтым-жа талёне адзначан і дзень наступнай яўкі.

Біржа Працы зараз выклікае беспрацоўнага на работу, насылаючы яму паведамленьне на кватэру, што дае магчымасьць беспрацоўнаму атрымаць работу без лішняй траты часу на Біржы.

Тураў.

Культурныя навіны.

Слоўнік вясковай мовы.

Сябра Заслаўскага райённага т-ва краязнаўства т. У. Шамешка зьбірае і ўкладае слоўнік мовы в. Недраскі, Заслаўскага райёну. Ужо апрацавана каля 7000 слоў.

Гэта будзе першы ў СССР слоўнік мовы адное вёскі. Ён пакажа багацьце мовы селяніна з аднае вёскі і будзе мець вялікае навуковае значэньне.

Апрача гэтага, т. Шамешка зьбірае словы іншых вёсак райёну і запісаў больш 300 мясцовых песьняў і каня 200 прыпевак.

Бібліаграфічная праца ў БССР.

Бібліаграфаваньне друку ўсёй Беларусі праводзіць бібліаграфічная камісія ІБК супольна з Дзяржаўнай Бібліятэкай. Камісія ў 1927 г. выдала чацьвёрты том „матар'ялаў да беларускай бібліаграфіі“. Падрыхтаваны да друку т. 1 «Прырода і вытворчыя сілы» і выпускаецца 2 томы «Археолёгія».

Наступныя томы: «Народная гаспадарка», «Палітычнае жыцьцё», «Мастацтва», „Мова і літаратура“, „Гісторыя і археолёгія“—маюць быць выданы ў працягу бліжэйшых 2-х год.

Апісаньне бягучага друку праводзяцца Беларускай Кніжнай Палатай, якая выдае „Летапіс беларускага друку“.

Асобая камісія пры Дзяржаўнай Бібліятэцы намецела скласьці бібліаграфічны экскурсійны дарадник для краязнаўцаў, у які ўключаюцца да 2.500 асноўных неабходных назваў.

ЦБ краязнаўства склаў бібліаграфію беларускага краязнаўства, куды ўваходзіць да 400 назваў і складаецца з 4-х аддзелаў. Бібліаграфаваньне краязнаўчай літаратуры на мясцох праводзіцца ў Магілеве і Віцебску акруговымі краязнаўчымі т-вамі.

Вывучэньне народнага мастацтва.

Дзеля вывучэньня беларускага народнага мастацтва Беларускі мастацкі тэхнікум арганізуе сёлета экспэдыцыю па вывучэньні беларускага народнага мастацтва: арнамэнту, разьбярства і інш. Экспэдыцыя мяркуе наведаць самыя глухія куткі Савецкай Беларусі, якія поўнасьцю захавалі сваю старажытную народную мастацкую творчасьць.

У працах экспэдыцыі прымуць удзел 10 лепшых студэнтаў тэхнікуму.

Вывучэньне культурных гнёзд.

ЦБ краязнаўства наладзіла вывучэньне «культурных гнёзд», гэта значыць, культурных асяродкаў, якія маюць ушыф на літаратуру, на арганізацыю музэяў, бібліятэк і інш. З гэтай мэтай зараз зьбіраюцца весткі аб стане мясцовай літаратуры, аб асноўных экспанатах музэяў, аб складаньні слоўнікаў мясцовых пісьменьнікаў, аб стане мясцовага пэрыядычнага друку і г. д.

Гэтыя матар'яды павінны даць цікавыя данныя аб нашым агульным культурным разьвіцьці і аб росьце ўсіх галін культурнага жыцьця.

Хроніка фізкультуры.

— 18 сакавіка гурток фізкультуры саюзу друкароў сьвяткуе 5-цігадовы юбілей свайго існаваньня.

У гэты дзень у клюбе друкароў адбудзецца вечарына, прысьвечаная юбілею.

— Сёньня камісія ў складзе гарадзкога архітэктара, інжэнэра і прадстаўнікоў БСФКВ і спартаб'яднаньня Дынамо складае плян набудовы цэнтральнага стадыёну на месцы іпадрому.

— Каток і лыжная станцыя „Прафінтэрн“ зачыніліся, прапрацаваўшы 3 месяцы.

— 20 сакавіка пачынаюцца клюбныя спаборніцтвы па гімнастычным пяцібор'і (для жанчын), стральбе і пяжкай атлётыцы.

— Хроніка фізкультуры(зімовага сьвята), выпушчаная Белдзяржкіно, будзе дэманстравацца ў кіно „Культура“ з наступнага тыдню

СУД.

Менсельпромаўскія растратчыкі.

Амаль два гады Міхель Дрэйзін быў загадчыкам гандлёвага магазыну Менсельпрому „Эканомія“.

Дрэйзіну жылося добра: пэнсія, танныя і добраякасныя тавары заўсёды пад рукой. Чаго больш трэбы? Часамі Дрэйзін забываў, што ён служачы, а лічыў сабе ўласнікам магазыну і ледзь ня купцом першай гільдыі.

Добра абстаўленная кватэра Дрэйзіна таксама весьлілася: розные пячэньне, какава, лепшы віна ня выводзіліся з сталовага буфэту Дрэйзіна.

Наогул, Дрэйзін з сям'ёй жаныў, што называецца.

Неяк у верасьні 1926 году Дрэйзін атрымаў загад Праўленьня Менсельпрому падлічыць тавары маемасьць, грошы і скласьці баланс.

Праверыў сваю гандлёвую ідэйнасьць зачас службы Дрэйзін і не далічыўся 3475 р. 8 кап.

— Глупства,—падумаў Дрэйзін,—што гэта за недалік? Сьпішу ўдечку, утруску і ўсушку, а то адну, другую сотню пакіну за балянсам, і ўсё будзе добра, тым больш што бухгальтар Гэмбіцкі Яша—свой чалавек і ў крыўду ня дасьць.

Адыходзячы з заняткаў, Дрэйзін зьвярнуўся да бухгалтара:

— Яша!

— Што?

— Сёньня ўвечары зайдзі да мяне на кватэру—пасядзім, вып'ем; апроч таго, я хачу падарыць табе адну рэч.

Гэмбіцкі—чалавек прагавіты на падарункі, любіцель сямейных вечароў з вышчукай пацісную руку начальніку і запэўніў, што прыдзе з 8-й гадзіне ўвечары.

Да прыходу Гэмбіцкага Дрэйзін і яго жонка рыхтаваліся: на стале зьявілася розная выпіўка і закуска, а на сьцяне вісеў новенькі партфэль з надпісам: «Я. Гэмбіцкаму на памяць».

Расьпішуны бутэльку моцнага віна, Дрэйзін падняс партфэль Гэмбіцкаму, а ўрэшце, расказаў аб недаліках тавараў і грошай.

— Глупства, Дрэйзін, ня сумуй! Я, брат, ведаю, як зрабіць, каб было ўсё шыта-крыта: сьпішу ўсушку, утруску, удечкі, а там будзе відаць—і рэшту „ваткнём“ у будучыню.

Як абяцаў, так і зрабаў Гэмбіцкі: недаліку шляхам падлогу расторкаў па ўсіх квіжках, толькі ніяк не выходзіў баланс.

Шыла ў мешку не ўтаіш сьледчая ўлада «дзейнасьць» Дрэйзіна і Гэмбіцкага раскрыла.

Менскі Акруговы Суд прыгаварыў Міхеля Дрэйзіна на 4 гады, а Якуба Гэмбіцкага—на тры гады выняволеньня з суровым адмежаваньнем і са спагнаньнем з іх салідарна па карысьць Менсельпрому 3475 р. 8 к.

Дастасаваўшы да асуджаных амністыю, Суд скараціў пакараньне Дрэйзіну да 2-х гад і Гэмбіцкаму—да 1 году і 6 месяцаў.

Д. Кастроў.

ЗАКОНЫ І ЗАГАДЫ ЎРАДУ БССР.

ПАСТАНОВА

Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў БССР

пра дапаўненьне „Палажэньня аб лясох мясцовага значэньня і аб вядзеньні гаспадарак у іх“ артыкулам 31.

Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляюць дадаць да „Палажэньня аб лясох мясцовага значэньня і аб вядзеньні гаспадарак у іх“ (З. З. БССР 1926 г., № 8, арт. 37) наступны артыкул:

«31. Калі паводле мясцовых умоў трэба зьмяніць склад карыстальнікаў лясоў мясцовага значэньня, з якімі заключан дагавор, то дагавор касуецца альбо зьмяняецца пастановаю раённага выканаўчага камітэту, зацьверджанаю акруговым выканаўчым камітэтам“.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Чарвякоў.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР М. Галадзед.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Хацкевіч.

1 сакавіка 1928 году.
г. Менск.

ПОСТАНОВЛЕНИЕ

Центрального Исполнительного Комитета и Совета Народных Комиссаров БССР

о дополнении „Положения о лесах местного значения и о ведении хозяйства в них“ статьей 31.

Центральный Исполнительный Комитет и Совет Народных Комиссаров БССР постановляют дополнить „Положение о лесах местного значения и о ведении хозяйства в них“ (С. З. БССР 1926 г., № 8, ст. 37) следующей статьей:

„31. Если по местным условиям необходимо изменить состав пользователей лесов местного значения, с которыми заключены договор, то договор расторгается или изменяется постановлением районного исполнительного комитета, утвержденным окружным исполнительным комитетом“.

Председатель Центрального Исполнительного Комитета БССР А. Червяков.

Председатель Совета Народных Комиссаров БССР Н. Голодед.

Секретарь Центрального Исполнительного Комитета БССР А Хацкевич.

1 марта 1928 г.
г. Минск.

ДЫСПУТ НА ТЭМУ „КУЛЬТУРА І МЯШЧАНСТВА“.

Менакругком ЛКСМБ і рэдакцыя газэты „Чырвоная Зьмена“ наладжваюць у нядзелю 18-га сакавіка ў клюбе „КІМ“ вялікі дыспут на тэму „Культура і мяшчанства“. Уступнае слова скажа намесьнік рэдактара «Комсомольск. Правды“ т. Бобрышаў.

На дыспут запрашаюцца т.т. Кнорын, Абрамчук, Сянкевіч, Давідовіч (ЦК КП(б)Б,) Бараньнікаў, Галавач, Ратнер, Шаліма, Пыканаў, Адзінец, Малкін (ЦК ЛКСМБ), прафэсары: Вольфсон, Васілеўскі, Кроль, Шапошнікаў, дацэнт Панькоўскі, усе сакратары і загадчыкі агітацыйна-прапагандысцкіх аддзелаў райкомаў і ячэек, а таксама ўсе жадаючыя.

(Білеты можна атрымаць у райкомах ЛКСМБ і клюбе „КІМ“ з 12 да 4 гадз. дня і 7 да 10 гадз. увечары).

КАНФЭРЭНЦЫЯ ЧЫТАЧОЎ „КОМСОМОЛЬСКОЙ ПРАВДЫ“.

Менакругком ЛКСМБ і рэдакцыя газэты „Чырвоная Зьмена“ склікаюць у пятніцу 16-га сакавіка гарадзкую канфэрэнцыю чытачоў «Комсомольской Правды» На парадку дню даклад намесьніка рэдактара „Комсомольской Правды“ тав. Бобрышава аб працы рэдакцыі Канфэрэнцыя адбудзецца ў клюбе «КІМ» а 7 гадз. увечары. Пасьля канфэрэнцыі—канцэрт.

(Білеты можна атрымаць у райкомах КСМ і клюбе «КІМ» з 12 да 4 гадз. і з 7 гадз. увечары).

Што слухаць па радыё.

Пятніца, 16-3.

6—00— 6—30	Гутарка 8-я па прыродазнаўству на тэму: «Чым вямля корміць расьліны».
6—30— 7—10	Беларуская радыё-газэта № 49.
7—10— 7—40	Гутарка аграномаў на тэму: 1] Мінэральныя ўгнаеньні і ўраджай. 2] Новая сьвінагадоўля ў БССР.
7—40— 8—10	Даклад на тэму: „Вурокі Парыскай Камуны“.
8—10—10	Канцэрт.

Субота, 17-3.

6—00— 6—30	Гутарка з веруючымі і няверуючымі з цыклю: „Кніга быцьця“.
6—30— 7—10	Беларуская радыё-газэта № 50 (з польск. аддзел.).
7—10— 7—40	Гутарка ТСА-Авіяхіму на тэму: „Першы Ўсебеларускі Зьезд ТСА-Авіяхіму“.
7—40— 8—10	Гутарка 3-я з цыклю: «Значэньне працэсу Беларускай Грамады».
8—10—10—00	Канцэрт.

Апавяшчэньні.

ГАБІНЭТ ПАЛІТАСЬВЕТЫ.

17 сакавіка—а 5-й гадзіне веч.—пасяджэньне выкладчыкаў матэматыкі і фізыкі вячэрніх школ пав, тыпу і рабочае моладзі.

— 18 сакавіка—а 5 гадзіне веч.—пасяджэньне калектыву настаўн. школ малапісьмен. На парадку дню—4-ы разьдзел праграмы школ м-п. (Дакл. па мал. групе т. Харкевіч, па стар. групе т.т. Голубева і Кунда).

Прысутнасьць абавязкова.

ДОМ АСЬТЕТЫ.

— Сёньня, 15 сакавіка, спэктакль-канцэрт—вечар пры ўдзеле: 2 Бел. Дз. Т-ру, Трупы Галубіка, Пятрова, Бясьсьмертнага. Танцы. Пачатак а 8-й гадз. Білеты ад 30—75. к. Збор—на карысьць „ОЗЕТ“.

— Сёньня, 15-III—заняткі музычнага гуртка пад кір. Захара. Пачатак а 8 з пал. гадз. Запіс у гурток працягнуты.

— У пятніцу, 16-III—кіно „Гюлян“. Сэансы ў 7 з пал. і 9 з пал. гадз. веч.

ПЭДГАБІНЭТ.

— У пятніцу, 16-III, а 7 гадз. увечары адбудзецца сход фізыка-матэматычнага гуртка.

ПАРАДАК ДНЮ:

Даклад ас. Дамброўскага на тэму: «Некаторая нелёгічнасьць у падручніках матэматыкі».

— Сёньня, 15-III, а 7-й гадз. вечара сход прыродазнаўчага гуртка настаўнікаў першага канцэнтру (1-й, 2-й, 3 і 4 гр).

На парадку дню—даклад тав. Паваротай „Прыродазнаўства ў 1-й і 2-й групах“.

— АПА Менакружкому КПБ склікае ў нядзелю, 18 сакавіка, у 12 г. дня ў Доме Асьветы сход камуністаў, членаў саюзу працасьветы (ячэек прап. асьветы, БДУ, інбелкульту, тэхнікумаў і г. д.).

Адказны рэдактар М. КУДЗЕЛЬКА

ДЗЯРЖАЎНЫ ЯЎРЭЙСКІ ТЭАТР.
ПЯТНІЦА, 16, і СУБОТА, 17, САКАВІКА. „ОВЕЧИЙ ИСТОЧНИК“.
Білеты ў касе тэатру от 12 да 2 і ад 5 г. в., у раб. касе—ад 11 з пал. да 2 і ад 4 да 6 г. веч.

КІНО «КУЛЬТУРА». З 14 сакавіка „СЕВЕРНАЯ ЛЮБОВЬ“ Звыш праграмы—гастролі вядомага Фрэда Марыон (чалавек аркестр).

КІНО „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА“. З панядзелка, 12 сакавіка, выдатны фільм „ЖИЗНЬ ЗА ЖИЗНЬ“ У 2-х сэрыях і 10 частк. Дзьве сэрыі—за адзін сэанс. Толькі два сэансы.

КІНО „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ“. Толькі 4 дні. З панядзелка, 12 сакавіка — ПАУЛЬ РЫХТЭР у фільме „НІБЕЛУНГІ“ 1-я сэрыя ў 12 частках.

КІНО «ПРАЛЕТАРЫ». З панядзелка, 12 сакавіка, бытавы баявік „БАБЫ РЯЗАНСКИЕ“

КІНО-ТЭАТР „КУЛЬТУРА“.
З аўторка, 20 сакавіка,
грандыёзны мастацкі фільм вытворчасьці БЕЛДЗЯРЖКІНО
„ЕГО ПРЕВОСХОДИТЕЛЬСТВО“
(Гірш Лекерт).
РЭЖЫСЭР В. РАШАЛЬ (пастаноўшчык ф-му „Господа Скотинины“). У 2-х галоўных ролях адначасова заслуж. артыст МХАТ ЛЕАНІДАЎ.
З чацьвярга, 15-га сакавіка, папярэдні продаж білетаў у касе тэатру ад 3-й гадз. дня.

раёне маскоўская «Брестьянская Газета» мае тыраж 850 экзэмпляраў, а самая высокатыражная менская газэта «Беларуская Вёска»—усяго 19. Дубровінскі рабочы раён выпісвае газэту «